НЕ ЗАДЕРЖИВАТЬ
ГАЗЕТЫ
Советская Беларусь
Мохилев

Усебеларускаму зьлёту ўдарнікаў-энтузіястаў калгасных палёў — бальшавіцкае прывітаньне!

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся! СССР. Пролетарии всех стран, соединяйтесь!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АЎТОРАК
7 ліпеня 1931 г.
№ 154 (3243)

У бой за кармы

Сенаўборачная кампанія ў поўным разгары. Сенаўборка зьяўляецца першай і складанай часткай уборачнай кампаніі. Разам з сіласаваньнем сенаўборка ў асноўным вырашае кармовую праблему ў БССР. Аднак, як у галіне сенаўборкі, так і асабліва ў галіне барацьбы за сілос, мы маем ганебнейшае адставаньне, глыбачэзныя прарывы. Досыць сказаць, што на 1-га ліпеня саўгасы скасілі 7,7 проц. пляну, калгасы—7,5 проц., аднаасобнікі і таго менш, усяго толькі 5,1 проц. Усё гэта складае выканаўнае пляну па сенаўборцы ў разьмеры 6,2 проц.

Такое адставаньне на фронце сенаўборкі стварае пагрозу забясьпечаньня кармавой базы сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Гэта гаворыць аб тым, што калгасы, саўгасы, а таксама і аднаасобнікі недаацэньваюць пытаньня аб кармовай праблеме. Яны забыліся аб тым сумным вопыце мінулага году і вясны гэтага году, калі недахоп кармоў цяжка адбіўся на разьвіцьці жывёлагадоўлі. Трэба зараз-жа зьнішчыць усе тыя рагаткі, якія перашкаджаюць бальшавіцкаму разгортваньню сенаўборачнай кампаніі. У саўгасах і калгасах трэба яшчэ і яшчэ раз паставіць пытаньне аб зьдзельшчыне, аб правільным вучоце працы, аб правільнай арганізацыі працы, аб разумнай расстаноўцы маючыхся сіл аб поўным скарыстаньні сенаўборачных машын і інвэнтара, аб шырокім разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Райкалгасаюзы, зямельныя часткі РВК, сельсаветы, праўленьні калгасаў, гаспадарнікі саўгасаў павінны неадкладна і рашуча зьнішчыць маючыяся прарывы, ліквідаваць адставаньне на сенаўборачным фронце, дагнаць і нават перагнаць іншыя рэспублікі і вобласьці.

Мільён тон сілосу і ніводнага кілё менш—вось тая праграма, якая ва ўмовах БССР зьяўляецца баявой праграмай па стварэньні моцнай кармавой базы сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Выкананьне яе—баявая задача калгасаў, саўгасаў і аднаасобнага сэктару. Аднак, на фронце сіласаваньня мы маем яшчэ больш ганебнае адставаньне, яшчэ больш значныя прарывы. На мясцох мы сустракаемся дзе-ні-дзе проста з апартуністычным супраціўленьнем сілосу. Чэрвеньскі плян сіласаваньня сарваны. Выкананы толькі 9 проц. пляну. Будаўніцтва ям і траншэй выканана ўсяго толькі на 0,6 %. Ня гледзячы на тое, што ўжо з пачатку чэрвеня неабходна было прыступіць да сіласаваньня кармоў, цэлы рад калгасаў нават і ня ўздумаў пачаць будаўніцтва ям і траншэй. Вось, напрыклад, у калгасе «Зьвязда» Мазырскага раёну цэлы год ляжаць клёпкі для сілоснай вежы, але ніхто палец аб палец ня ўдарыў, каб пабудаваць вежу. У Полацкім раёне з-за няпрыдатнасьці выключэньнем да сіласаваньня кармоў не прыступлена. У Клічаўскім раёне плошча пасеву сілосных культур значна скарочана, ямы ня будуюцца. Каб выканаць плян сіласаваньня неабходна сваячасова падрыхтаваць 1.800 тыс. куб. мэтраў ям і траншэй, а між тым, на 1-га ліпеня ў раёнах БССР вырыта толькі каля 20 тыс. куб. мэтраў ям і траншэй. Напрыклад, Барысаўскі раён павінен быў падрыхтаваць 37 тыс. куб. мэтраў, а пакуль-што падрыхтаваў толькі 100. Сураскі з 15 тыс. куб. мтр. загатаваў толькі 38. Такое-ж становішча ва Ўзьдзенскім, Віцебскім, Лёзьненскім і інш. раёнах.

Заводы Лесбелу, Менскі «Дрэваапрацоўшчык» і Бабруйскі камбінат ня выконваюць дагавораў аб свячасовай адгрузцы сілосных вежаў. З 388 сілосных вежаў на 1-га ліпеня адгружана толькі 50. Незадавальняюча ідзе таксама падрыхтоўка кадраў для сіласаваньня. У радзе раёнаў курсы па падрыхтоўцы майстраў па праведзеньні сіласаваньня зрываюцца.

Толькі малая колькасьць калгасаў і саўгасаў сапраўды па-бальшавіцку змагаюцца за сілос. Так, напрыклад, у калгасе «Сіла» Вульскага раёну, адначасова з сенаўборкай пачата і сіласаваньне. Вельмі пасьпяхова ў гэтым калгасе капаюцца сілосныя ямы. Калгас «Зара» у Лёзьненскім раёне толькі скончыў сяўбу і зараз-жа пачаў сіласаваньне. За 3 дні калгас вырыў сілосныя ямы і залажыў 20 тон сілосу. Але такіх прыкладаў вельмі мала.

Сілос у небясьпецы. На сенаўборачным фронце БССР значна адстае. Усё гэта стварае пагрозу ў вырашэньні кармовай праблемы. Прарывы на фронце сілосу і сенаўборкі павінны быць зараз-жа і безадкладна ліквідаваны. Апартуністычнаму супраціўленьню сілосу павінен быць дадзены рашучы зьнішчальны адпор.

Сілос і ўборку сенажацьцяў—на ўдарныя рэйкі.

Новыя абставіны-новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва.

Прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў 23-га чэрвеня 1931 году*)

«Спэцыедзтва» заўсёды лічылася і застаецца ў нас шкодным і ганебным зьявішчам. І так, зьмяніць адносіны да інжынэрна-тэхнічных сіл старой школы, прыцягнуць да іх больш увагі і клопатаў, сьмялей, прыцягваць іх да работы—такая задача. Так стаіць справа з пытаньнем аб 5-й новай умове разьвіцьця нашай прамысловасьці.

Пяройдзем да пытаньня аб апошняй умове.

6. Аб гаспадарчым разрахунку

Малюнак быў-бы непоўным, калі-б я не закрануў яшчэ адной новай умовы, Гутарка ідзе аб крыніцах накапленьня для прамысловасьці, для народнай гаспадаркі, аб узмацненьні тэмпаў гэтага накапленьня.

У чым заключаецца новае і асабліва ў разьвіцьці нашай прамысловасьці з пункту погляду накапленьня?—У тым, што старыя крыніцы накапленьня пачынае ўжо нехапаць для далейшага разгортваньня прамысловасьці. У тым што неабходна, значыцца, намацаць новыя крыніцы накапленьня і ўзмацніць старыя, калі мы сапраўды хочам захаваць і разьвіць бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі. З гісторыі капіталістычных краін вядома, што ні адна маладая дзяржава, якая жадала падняць на вышэйшую ступень сваю індустыю, не абыходзілася без дапамогі звонку ў выглядзе доўгатэрміновых крэдытаў або пазык. Выходзячы з гэтага, капіталісты заходніх краін начыста адмовілі нашай краіне ў крэдытах, мяркуючы, што адсутнасьць крэдытаў і пазык абавязкова падрэжа індустрыялізацыю нашай краіны.

Але капіталісты памыліліся, яны ня ўлічылі таго, што наша краіна, у адрозьненьне ад краін, капіталістычных, мае ў сваім распараджэньні некаторыя асобныя крыніцы накапленьня, дастатковыя для яго, каб абнавіць і разьвіць далей індустрыю. Сапраўды мы ня толькі аднавілі прамысловасьць, ня толькі аднавілі сельскую гаспадарку і транспарт, але мы пасьпелі ўжо паставіць на рэйкі грандыёзную справу рэканструкцыі цяжкай прамысловасьці сельскай гаспадаркі, транспарту. Зразумела, што на гэту справу пайшлі ў нас дзесяткі мільярдаў рублёў. Адкуль чэрпаліся гэтыя мільярды?

З лёгкай прамысловасьці, з сельскай гаспадаркі, з бюджэтных накапленьняў. Так ішла ў нас справа да апошняга часу. Зусім інакш стаіць справа цяпер. Калі раней хапала старых крыніц накапленьня для рэканструкцыі прамысловасьці і транспарту, то зарэз пачынае ўжо яўна не хапаць. Справа ідзе цяпер не аб тым, каб рэканструяваць старую прамысловасьць. Справа ідзе аб стварэньні новай тэхнічна-ўзброенай прамысловасьці на Урале, Сібіры, Казакстане. Справа ідзе аб стварэньні новай буйнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці збожжавых і жывёлагадоўчых сырцовых раёнаў СССР. Справа ідзе аб стварэньні новай чыгуначнай сеткі паміж усходам і захадам СССР. Зразумела, што старых крыніц накапленьня ня можа хапіць на гэту грандыёзную справу. Але гэта ня ўсё. Да гэтага трэба дадаць тую акалічнасьць што, у выніку безгаспадарчага аўздзеньня справы, прынцыпы гаспадарчага разрахунку аказаліся зусім падарванымі ў цэлым радзе нашых прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый. Гэта факт, што ў радзе прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый даўно ўжо кінулі лічыць «калькуляваць, складаць абгрунтаваныя балянсы даходаў і расходаў. Гэта факт, што ў радзе прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый паняцьці: «рэжым эканоміі», «скарачэньне непрадукцыйных выдаткаў», «рацыяналізацыя вытворчасьці»—даўно ўжо вышлі з моды. Відавочна, яны разьлічваюць на тое, што Дзяржбанк «усёроўна нам выдасьць неабходныя сумы». Гэта факт, што ў апошні час сабекошт у цэлым радзе прадпрыемстваў пачаў павышацца. Ім дано заданьне зьнізіць сабекошт на 10 і больш процантаў, а яны яго павышаюць. А што такое зьніжэньне сабекошту? Вы ведаеце, што кожны процант зьніжэньня сабекошту азначае накапленьні ўнутры прамысловасьці на 150-200 мільёнаў руб. Ясна, што павышаць сабекошт у гэтых умовах, значыць траціць для прамысловасьці і ўсёй народнай гаспадаркі сотні мільёнаў рублёў. З усяго гэтага вынікае, што нельга ўжо больш абарочвацца на адной толькі лёгкай прамысловасьці, на адных толькі бюджэтных накапленьнях, на адных толькі даходах сельскай гаспадаркі. Лёгкая прамысловасьць прадстаўляе багацейшую крыніцу накапленьня, яна мае цяпер усе шансы разьвівацца далей, але крыніца гэта не бязьмежная.

Сельская гаспадарка прадстаўляе ня менш багатую крыніцу накапленьня, але яна сама мае патрэбу цяпер, у пэрыяд яе рэканструкцыі, у фінансавай дапамозе ад дзяржавы. Што датычыць бюджэтных накапленьняў, дык самі ведаеце, што яны ня могуць і не павінны быць бязьмежнымі. Што-ж застаецца?

Застаецца цяжкая прамысловасьць. Значыць, трэба дабіцца таго, каб цяжкая прамысловасьць і, перш за ўсё, яе машына-будаўнічая частка таксама давала накапленьні. Значыць, узмацняючы і разгортваючы старыя крыніцы накапленьня, трэба дабіцца таго, каб цяжкая прамысловасьць і, перш за ўсё, машынабудаўніцтва таксама давалі накапленьні. У гэтым выхад. А што для гэтага патрэбна?

Зьніжэньне безгаспадарчасьці, мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці, укараненьне і ўмацаваньне гаспадарчага разрахунку ва ўсіх нашых прадпрыемствах, сыстэматычнае зьніжэньне сабекошту, узмацненьне ўнутрыпрамысловага накапленьня ва ўсіх без выключэньня галінах прамысловасьці. Такі шлях да выхаду. І так, укараніць і ўмацаваць гаспадарчы разрахунак, падняць унутры прамысловае накапленьне—такава задача.

7. Па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць

Такады, таварышы, новыя ўмовы разьвіцьця нашай прамысловасьці. Значэньне гэтых новых умоў заключаецца тое, што яны ствараюць для прамысловасьці новую абстаноўку, якая патрабуе новых прыёмаў работы, новых прыёмаў кіраўніцтва.

І так: а) выходзіць, такім чынам, што нельга ўжо разьлічваць больш па старому на самацёк рабочай сілы. Каб забясьпечыць прамысловасьць рабочай сілай, трэба яе набіраць арганізаваным парадкам трэба мэханізаваць працу

Думаць, што можна абыйсьціся без мэханізацыі пры нашых тэмпах работы і маштабах вытворчасьці, значыць спадзявацца на тое, што можна вычарпаць мора ложкай. б) Выходзіць далей, што нельга далей цярпець цякучасьць рабочай сілы ў прамысловасьці. Каб пазбавіцца ад гэтага зла, трэба арганізаваць зарплату па-новаму і зрабіць склад рабочых на прадпрыемствах больш ці менш пастаянным. в) Выходзіць далей, што нельга больш цярпець абязьлічку ў вытворчасьці. Каб пазбавіцца ад гэтага зла, трэба па-новаму арганізаваць працу трэба расставіць сілы такім чынам, каб кожная група рабочых адказвала за работу, за мэханізмы, за варштаты, за якасьць работы. г) Выходзіць далей, што немагчыма больш па-старому абыходзіцца з тым мінімумам старых інжынэрна-тэхнічных сіл, які пакінуты у спадчыну ад буржуазнай Расіі. Каб падняць цяперашнія тэмпы і маштабы на вытворчасьці, трэба дабіцца, каб у рабочай клясы была свая ўласная вытворча-тэхнічная інтэлігенцыя. д) Выходзіць далей, што нельга па-старому валіць у адну кучу ўсіх спэцыялістаў, інжынэрна-тэхнічныя сілы старой школы. Каб улічыць зьмененую абстаноўку, трэба зьмяніць нашу палітыку, правяць максымум клопатаў у адносінах да тых спэцыялістаў і інжынэрна-тэхнічных сіл, якія выразна паварочваюць у бок рабочае клясы. е) Выходзіць, нарэшце, што нельга па-старому абарочвацца на старых крыніцах накапленьня. Каб забясьпечыць далейшае разгортваньне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, трэба да біцца таго, каб пусьціць у справу новыя крыніцы накапленьня, ліквідаваць безгаспадарчасьць, укараніць гаспадарчы разрахунак, зьнізіць сабекошт, і падняць унутрыпрамысловае накапленьне. Такавы новыя ўмовы разьвіцьця прамысловасьці, якія патрабуюць новых прыёмаў работы, новых прыёмаў кіраўніцтва гаспадарчым будаўніцтвам. Што патрэбна для таго, каб наладзіць кіраўніцтва па-новаму?

Для гэтага патрэбна, перш за ўсё, каб нашы гаспадарчыя кіраўнікі зразумелі новую абстаноўку, вывучылі канкрэтна новыя ўмовы разьвіцьця прамысловасьці і перабудавалі сваю работу адпаведна патрабаваньням новай абстаноўкі. Для гэтага патрабуецца, далей, каб нашы гаспадарчыя кіраўнікі прадпрыемствамі не «наогул», не «з паветра», а канкрэтна, прадметна, каб яны падыходзілі да кожнага пытаньня ня з пункту погляду агульнай балбатні, а строга дзелавым чынам, каб яны не абмяжоўваліся паперовай перапіскай або агульнымі фразамі і лёзунгамі, а ўдумляліся ў тэхніку справы, удумляліся ў дэталі справы, удумляліся «ў дробязі», бо «з дробязяй» будуюцца цяпер вялікія справы. Для гэтага патрабуецца, далей, каб нашы цяперашнія грамадзкія аб'яднаньні, якія маюць іншы раз у сваім складзе прадпрыемствы, разбуйнець безадкладна і разьбіць на некалькі аб'яднаньняў. Зразумела, што прадпрыемствы і аб'яднаньні, якія маюць справу з сотняй і больш заводаў, ня могуць па-сапраўднаму ведаць гэтых заводаў, іх магчымасьцяй, іх работы, Зразумела, што, ня ведаючы заводаў, яны ня ў стане кіраваць імі. Стала быць, каб даць магчымасьць старшыням аб'яднаньняў па-сапраўднаму вывучыць заводы і кіраваць імі, трэба іх разгрузіць ад лішкі заводаў, трэба разьбіць аб'яднаньне на некалькі аб'яднаньняў, наблізіць аб'яднаньні да заводаў. Для гэтага патрабуецца далей, каб нашы аб'яднаньні перайшлі ад калегіяльнага кіраўніцтва да кіраўніцтва аднаасобнага. Зараз справа стаіць так, што ў калегіях аб'яднаньняў сядзяць па 10-15 чал., пішуць паперы, вядуць дыскусію. Кіраваць так далей нельга, таварышы. Трэба спыніць паперовае «кіраўніцтва» і пераключыцца на сапраўды дзелавую бальшавіцкую работу. Няхай застаецца на чале аб'яднаньня старшыня аб'яднаньня і некалькі намесьнікаў. Гэта будзе зусім даволі для кіраўніцтва аб'яднаньнем. Рэшту членаў калегіі лепш было-б спусьціць уніз на заводы і фабрыкі. Гэта было-б куды больш карысным для іх і для справы. Для гэтага патрабуецца, далей, каб старшыні аб'яднаньняў і іх намесьнікі часьцей аб'язджалі заводы, пабольш заставаліся-б там для работы, лепш знаёміліся з заводзкімі работнікамі і ня толькі вучылі мясцовых людзей, але і вучыліся-б у іх. Думаць, што можна кіраваць цяпер з канцылярыі, седзячы ў канторы, здалёк ад заводаў, — значыць заблуджацца.

Каб кіраваць заводамі, трэба больш часта зносіцца з рабочымі прадпрыемстваў, трэба падтрымліваць з імі жывую сувязь. Нарэшце, два словы аб нашым вытворчым пляне на 1931 год.

Існуюць некаторыя каляпартыйныя збываталі, якія запэўніваюць, што наша вытворчая праграма нерэальная, невыканальная. Гэта нешта чакшталт «праму дзіры пракароў» Шчадрына, якія заўсёды гатовы пашыраць вакол сябе «пустоту недомыслия». Ці рэальна наша вытворчая праграма?

— Бязумоўна, так. Яна рэальна хаця-б таму, што ў нас ёсьць у наяўнасьці ўсе неабходныя ўмовы для яе ажыцьцяўленьня. Яна рэальна хаця-б таму, што яе выкананьне залежыць цяпер выключна ад нас саміх, ад нашага ўменьня і нашага жаданьня скарыстаць багацейшыя магчымасьці, якія ў нас ёсьць. Чым-жа інакш вытлумачыць той факт, што цэлы рад прадпрыемстваў і галін прамысловасьці ўжо перавыканалі плян? Было-б глупствам думаць, што вытворчы плян зводзіцца да пералічэньня лічбаў і заданьняў. На самой справе вытворчы плян—ёсьць жывая і практычная дзейнасьць мільёнаў людзей. Рэальнасьць нашага вытворчага пляну—гэта мільёны працоўных, якія творыць новае жыцьцё. Рэальнасьць нашай праграмы—гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасьць працаваць па-новаму, наша рашучасьць выканаць плян. Ці ёсьць у нас яна, гэта самая рашучасьць? Так, ёсьць. Значыць, наша вытворчая праграма можа і павінна быць ажыцьцёўлена. (Працяжныя воплескі).

*) Канец. Пачатак гл. у № 153.

Арганізуем масавы прыліў у калгасы

імя XI-годзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў

Усебеларускі заклік XI-годзьдзя павінен даць новыя тысячы калгасьнікаў

Наша месца толькі ў калгасе

За час правядзеньня кампаніі па вучоту аб'ектаў абкладаньня па Рагінскім сельсавеце Б. Кашалёўскага раёну пасьля дэталёвага растлумачэньня бяднацка-серадняцкім масам задач калгаснага руху, пачаўся вялікі прыліў у калгасы: Так, у калгас «Чырвоны Сьцяг» улілося 8 гаспадарак; у калгас «Улада саветаў»—39 гаспадарак; у калгас «Камунар» 4 гаспадаркі. Зараз у сельсавеце ёсьць 4 калгасы з лікам 210 гаспадарак. Рост з кожным днём пашыраецца.

— Наша месца толькі ў калгасе—гаворыць беднякі і сераднякі. Я. Кур.

Штодня новы прыліў

У в. Вазёры, Койданаўскага раёну, існавала гняздо кулакоў і падкулачкаў, якія ўсімі мерамі імкнуліся спыніць калгасны рух. У сучасны момант гэтыя элемэнты ўжо выкрыты, большая частка бяднацка-серадняцкіх гаспадарак уступіла ў калгас.

Зараз у в. Вазёры ёсьць 140 гасп. калгасьнікаў. Штодня ў калгас улітаюцца новыя бяднацка-серадняцкія гаспадаркі. Хутка вёска Вазёры зробіцца вёскай суцэльнай калектывізацыі. П. Крэсік.

Партячэйкі кіруюць масавым прылівам

За 10 дзён чэрвеня ў калгасы Ельскага раёну улілося больш за 360 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Вёска Забалоцьце, Стара-Высоцкага сельсавету, цалкам уступіла ў калгас. Зараз гэты сельсавет калектывізаваны на 60 проц. Рамязоўскі с.-с. ужо стаіць на шляху суцэльнай калектывізацыі. У ім за адну дэкаду ўлілося ў калгасы каля 200 гаспадарак.

Новыя калгасьнікі бяз усякіх хістаньняў абагульваюць сваю жывёлу і яравыя пасевы. Калгасы падрыхтавана сустрэлі ўборачную кампанію. Усюды праведзена зьдзельшчына. Партячэйкі гэтых сельсаветаў стаяць на чале гэтай масава-палітычнай кампаніі. Герасіменка.

Новая хваля прыліву ў калгасы

Ворша. (Наш кар.). Праведзеная кампанія па ўліку аб'ектаў абкладаньня с.-г. падаткам на гэты год і растлумачальная работа пра новы закон аб падатку, выклікала на Аршанпчыне новы магутны прыліў у калгасы. За апошнюю дэкаду у калгасы ўлілося звыш 300 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Частка арганізавалася ў новыя калгасы, як, напрыклад, у в. Харкаўка і Чырвоная Харкаўка, Панізоўскага сельсавету, у Крапіўненьскім і Высоцкім сельсаветах. У Межаўскім сельсавеце арганізавалася 3 калгасы, у якія ўступіла 128 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. У Барысаўскім сельсавеце арганізаваўся калгас з 52 гаспадарак. У Пішчалаўскім—1 калгас з 11 гаспадарак. У Бразьдзечынскім сельсавеце арганізавалася 2 новых калгасы.

Напярэдадні ўсе сельсаветы па калектывізацыі па Аршанпчыне ідуць Веравойшанскі сельсавет, які калектывізаваны на 98,4 проц. Там па-за калгасамі засталося ўсяго 6 гаспадарак з 442. Сталінскі—калектывізаваны на 96 проц.,—засталося 4 гаспадаркі, а за імі ідуць Кудаеўскі сельсавет, які калектывізаваны на 74,8 проц., Машкоўскі—на 72 проц., Пішчалаўскі—на 68 проц. і Межаўскі—на 58 проц.

Па ўсім раёне зараз у калгасах наліч ваецца каля 50 проц. усіх бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

А. К.

Падлік працы і ўвядзеньне працоўных кніжак папоўнілі рады калгасаў

ЦЕРАХАЎКА. (Белта). У прох калгасах Ленінскага сельсавету вучот працадзён і выдача працакніжак цалкам скончаны. Працадні запісаны за ўвесь час існаваньня калгасу па 15 чэрвеня г. г. Астатнія працадні запісваюцца паступова ў працэсе работы.

За пяцідзённік вучоту працы ў калгас «Ленінскі Шлях» уступіла 8 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Адкрыўся Усебеларускі зьлёт калгасьнікаў

Сёньня 7-га ліпеня а 7-ай гадзіне ўвечары ў Доме Калгасьніка адкрываецца Ўсебеларускі зьлёт брыгадзіраў калгасьнікаў. Зьлёт прысьвечаны пытаньням вынікаў веснавой сяўбы, правядзеньня ўборачнай кампаніі, падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы і арганізацыі працы ў калгасах.

На зьлёт прыедзе 300 чалавек, якія прабудуць у Менску два дні.

Бальшавіцкія мэтады работы

прывялі да пасьпяховага выкананьня фінпляна

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР

АБ ВЫНІКАХ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ ЗА ДРУГІ КВАРТАЛ 3-га РАШАЮЧАГА ГОДУ ПА АРШАНСКІМ РАЁНЕ І ГОМЕЛЬШЧЫНЕ:

1. Адзначыць, што загадчыкам Аршанскага раённага фінансавага аддзелу т. Буяковым, а таксама і ўсімі работнікамі раённых фінансавых савецкіх органаў і грамадзкіх арганізацый па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў у другім квартале праведзена ўпаў не здавальняючая арганізацыйна-масавая работа, што прывяло да звышстопроцантнага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў па раёне.

Канстатаваць, таксама здавальняючую работу па мабілізацыі сродкаў Гомельскага гарфінаддзелу, Лепельскага, Межанскага, Тураўскага, Сіроцінскага, Асіпавіцкага і Слуцкага райфін аддзелаў

2. За звышстопрацантнае выкананьне фінпляну па мабілізацыі сродкаў насельніцтва за энэргічную баявую работу, за ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў работы,—работнікаў ўсіх фінансавых, савецкіх і грамадзкіх арганізацый Аршанскага раёну перадаць пераходзячы чырвоны сьцяг Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР Аршанскаму раённаму фінаддзелу.

3. Лічыць неабходным прэміраваць лепшых работнікаў—ударнікаў фінансавых ,савецкіх і грамадзкіх арганізацый Аршаншчыны і Гомельшчыны па мабілізацыі сродкаў у другім квартале і распаўсюджваньню пазыкі; для гэтай мэты выдаць 1.500 руб. Аршанскаму райфінаддзелу і 1.000 руб. Гомельскаму гарфінаддзелу.

Абавязаць Аршанскі райфінаддзел і Гомельскі гарадзкі фінансавы аддзел прэміраваньне работнікаў - ударнікаў зрабіць па ўзгадненьні з адпаведным Райвыканкомам і Рарсаветам.

Народны Камісар Фінансаў БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Прэміяваны лепшыя раёны,

ўдарнікі рабочыя і спэцыялісты за пасьпяховае правядзеньне калектывізацыі і веснавой сяўбы

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства БССР аб прэміраваньні раёнаў за лепшае правядзеньне с.-г. кампаніі ўвесну 1931 г.

Разгледзіўшы папярэднія матар'ялы раёнаў, якія больш пасьпяхова справіліся з выкананьнем пастаўленых партыяй і ўрадам задач па калектывізацыі і правядзеньні веснавой сяўбы 1931 г. Калегія НКЗ адзначае, што:

1. Койданаўскім жывёлагадоўчым раёнам калектывізавана 91,1 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак раёну.

Засеяна яравых культур 39.944 га, ці 103,3 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах засеяна: бульбы 8.341 га, ці 98,9 проц. да пляну, кармовых кораньплодаў 1.061 га, ці 95,1 проц., тэхнічных — лёну і канапель 1.438 га, ці 140,8 проц., сіласных 460 га, ці 70 проц., траў аднагадовых на сена 5.177 га, ці 85,8 проц. да пляну.

2. Лепельскім лёнаводчым раёнам калектывізавана 81,1 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 24.588 га, ці 106,8 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: тэхнічных—лёну і канапель 5.243 га, ці 127,3 проц., бульбы 5.905 га, ці 118,1 проц., кармовых кораньплодаў 548 га, ці 66,7 проц.

3. Высачанскім лёнаводчым раёнам калектывізавана 64,5 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 20.166 га, ці 110,9 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: тэхнічных—лёну і канапель 5.007 га, ці 169,3 проц., бульбы 2.801 га, ці 93,8 проц., кармовых кораньплодаў 377 га, ці 53,3 проц.

4. Вушацкім лёнаводчым раёнам калектывізавана 42,5 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 23.241 га, ці 104,4 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: тэхнічных—лёну і канапель 3.682 га, ці 100,5 проц., бульбы 5.235 га, ці 105,1 проц., кармовых кораньплодаў 363 га, ці 42,4 проц.

5. Жыткавіцкім жывёлагадоўчым раёнам калектывізавана 47,5 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 9.883 га, ці 106,4 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: бульбы 2.707 га, ці 108,2 проц., кармовых кораньплодаў 85 га, ці 71,4 проц., тэхнічных—лёну і канапель 704 га, ці 151,7 проц.

6. Халопеніцкім лёнаводчым раёнам калектывізавана 52,4 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 17.980 га, ці 102,3 проц., у тым ліку па вядучых культурах: тэхнічных—лёну і канапель 3.648 га, ці 102 проц., бульбы 4.143 га, ці 100,1 проц., кармовых кораньплодаў 193 га, ці 32,7 проц.

7. Талачынскім лёнаводчым раёнам калектывізавана 54,7 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 23.758 га, ці 101,6 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: тэхнічных—лёну і канапель 3.980 га, ці 108,6 проц., бульбы 6.279 га, ці 100 проц., кармовых кораньплодаў 379 га, ці 37,2 проц.

8. Аршанскім садова-гародным раёнам калектывізавана 55,3 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 26.763 га, ці 101,5 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: гародніх 1.079 га, ці 82,4 проц., бульбы 7.279 га, ці 99.9 проц., тэхнічных—лёну і канапель 1.589 га, ці 104,4 проц., кармовых кораньплодаў 622 га, ці 56 проц.

9. Чырвонапольскім лёнаводчым раёнам калектывізавана 38,7 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 25.933 га, ці 100,7 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: бульбы 5.409 га, ці 101,1 проц. тэхнічных—лёну і канапель 5.116 га, ці 104,4 проц., кармовых кораньплодаў 382 га, ці 39,5 проц.

10. Гарадокскім лёнаводчым раёнам калектывізавана 44,9 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Засеяна яравых культур 39.312 га, ці 88,6 проц. да пляну, у тым ліку па вядучых культурах: тэхнічных—лёну і канапель 10.520 га, ці 101,5 проц., бульбы 6.237 га, ці 83,6 проц., кармовых кораньплодаў 1.674 га, ці 75,4 проц.

Павялічэньне тэхнічных культур на Гарадокскім раёне складае на 7,50 га, або на 200 проц. супроць мінулага году.

Выходзячы з гэтага Калегія Народнага Камісарыяту Земляробства пастанаўляе:

1. За лепшае правядзеньне калектывізацыі, веснавой сяўбы наогул і па асноўных культурах: тэхнічных—лёну і канапель, бульбы і кармовых кораньплодаў, зьяўнуцца з хадайніцтвам у ЦК КП(б)Б, Прэзыдыўм ЦВК, СНКБ і ЦСПСБ аб прэміраваньні:

а) Койданаўскага раёну пераходным сьцягам імя ЦК КП(б)Б.

б) Лепельскага раёну пераходным сьцягам імя Х-га Ўсебеларускага зьезду Саветаў.

в) Аршанскага раёну пераходным сьцягам імя ЦСПСБ.

2. Прасіць СНК абвясьціць падзяку прэзыдыўмам Койданаўскага, Лепельскага, Аршанскага, Талачынскага, Гарадокскага, Вушацкага, Чырвонапольскага, Халопеніцкага, Высачанскага і Жыткавіцкага раёнаў і выдаць грашовыя прэміі кіраўнікам пералічаных раёнаў у складзе 3-х асоб, за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

Адначасова з гэтым прэміраваць:

а) Койданаўскі, Лепельскі, Гарадокскі, Аршанскі і Талачынскі раёны легкавымі аўтамашынамі, а Вушацкі і Чырвонапольскі палутаратоннымі грузавымі аўтамашынамі.

б) Даручыць Белкалгасцэнтру і Беларускаму Аддзяленьню Трактарацэнтру прэміраваць па сваёй галіне старшынь райкалгасаюзаў, калгасаў, дырэктароў, лепшых ударнікаў-рабочых і спэцыялістаў МТС, якія пасьпяхова правялі калектывізацыю і веснавую сяўбу.

3. Прыняць да ведама аб праведзеным прэміраваньні саўгасаў за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы:

а) Белсаўгастрэстам саўгасаў: Рачкавічы, Стрэлічна, Вязьынь-Фанпіаль, Навасёлкі і Забычаны.

б) Сьвінагадоўчым трэстам саўгасаў: Кухцічы, Ленца, Хальч, Мсьціслаўль, Цецерына, Замошша, Разульмова і Сялец-Гаўрылаўка.

в) Насеннаводтрэстам саўгасаў: Ачаса-Рудня і Слабада.

г) Белказапсаюзам саўгасу Барысаўкі.

Народны камісар Земляробства БССР Рачыцкі.

30 чэрвеня 1931 г.

Фашысцкая Польшча напярэдадні гаспадарчай катастрофы

45 проц. капіталаў польскіх акцыянэрных таварыстваў належыць заграніцным капіталістам

ВАРШАВА, 4. Прэм'ер Прыстар выступіў на сходзе парляментскага клюбу беспартыйнага блёку з прамовай, прысьвечанай эканамічнаму палажэньню Польшчы.

Адзначаючы, што сучасны крызіс—глыбейшы і больш сурёзны, чым усе па пярэдніх, і што ён асабліва рэзка адбіваецца на такіх краінах, як Польша, экспартуючых сельска-гаспадарчую і прамысловую сыравіну, прэм'ер падкрэсьліў моцную залежнасьць Польшчы ад заграніцы, што знаходзіць свой адбітак ужо ў тым адным факце, што каля 45 проц. усяго капіталу польскіх акцыянэрных таварыстваў належыць замежным капіталістам. Прыстар папярэдзіў, што з прычыны цяжкага фінансавага палажэньня ўрад рашыў пагоршыць якасьць будаўніцтва, перайшоўшы ад мураваных пабудоў да драўляных і да т. п. Што датычыць пытаньня аб беспрацоўі, дык прэм'ер абмежаваўся тым, што выступіў супраць ужываньня эвыштэрміновых гадзін, супроць уцягненьня новых рабочых кадраў у гарады і парэзі, па магчымасьці, ісьці па лініі скарачэньня ліку рабочых дзён, а ня ліку занятых рабочых.

Крывавыя бойкі беспрацоўных з паліцыяй у Балгарыі

ВЕНА, 4. Друк паведамляе ў Сафіі, што па ўсёй Балгарыі шырыцца хваля забастовак, з прычыны чаго становіцца усё больш бліжкай небясьпека гэнэральнай забастоўкі.

2-га ліпеня ў Ямвоне забастовачныя пікеты кінулі некалькі штрэйкбрэхераў у рэчку. Паліцыя, якая ахоўвала штрэйкбрэхераў, пачала агонь па бастуючых рабочых і ранила 4 чалавекі. Абураныя рабочыя зь

М. Гарлакевіч

Дзень канстытуцыі Саюзу ССР

30 сакавіка 1922 году першым Зьездам Саветаў ўсяго Саюзу была прынята дэкларацыя і дагавор аб утварэньні адзінай савецкай дзяржавы. Гэты момант трэба лічыць пачаткам існаваньня Саюзу ССР, канстытуцыйнае афармленьне якога адбылося 6-га ліпеня 1923 году. У гэты дзень была прынята канстытуцыя Саюзу ССР. Гэтым вялікім актам гістарычнага значэньня было афармлена добраахвотнае аб'яднаньне савецкіх рэспублік у адзіны саюз пралетарскіх дзяржаў. Канстытуцыя замацавала асновы нацыянальнай палітыкі савецкай улады шляхам утварэньня моцнага фундаманту ў выглядзе адзінай шматнацыянальнай савецкай дзяржавы на 1/6 частцы зямной кулі.

Да ўтварэньня Саюзу ССР існавалі рад савецкіх рэспублік, якія знаходзіліся ў большай альбо меншай сувязі з РСФСР. Спачатку дагавор аб утварэньні Саюзу ССР быў падпісан паміж РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР. Пазьней да гэтага дагавору далучыліся Туркменская і Узьбецкая ССР, а ў 1929 г. в складу Узьбецкай ССР была вылучана ў якасьці саюзнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі—Таджыцкая ССР.

У дэкларацыі аб утварэньні Саюзу ССР (падзел 1-ы Канстытуцыі СССР) адзначаецца, што «там, у лягеры капіталізму,—нацыянальная розьнь і няроўнасьць, калёніяльнае нявольніцтва, паўвінізм, нацыянальнае прыгнечаньне і пагромы, імпэрыялістычныя зьверствы і войны. Тут, у лягеры сацыялізму,—узаемнае давер'е і мір, свабода і роўнасьць, мірнае сужыцьцё і братэрскае супрацоўніцтва народаў».

У гэтых словах заключаюцца вынікі практычнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў Саюзе ССР. Тут нацыянальнае пытаньне вырашаецца зусім інакш, чым у капіталістычных дзяржавах. Адзінай формай роўнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня зьяўляецца дыктатура пралетарыяту. Імпэрыялізм будуе сваю нацыянальную палітыку на прынцыпах прыгнечаньня і эксплёатацыі. Самастойнае разьвіцьцё гістарычна-адстаўных нацыянальнасьцяй за ўмовах імпэрыялізму абсалютна немагчыма. І зусім на іншых падставах будуе сваю нацыянальную палітыку Саюз ССР, які адхіляе ўсялякі прымус у адносінах да розных нацыянальнасьцяй. Ён прызнае роўную роўнасьць і неабмежаваную сувэрэннасьць народаў у справе вызначэньня свайго лёсу.

Саюз ССР зьяўляецца арганізацыяй нацыянальнасьцяй для будаўніцтва сацыялізму. Тыя вялізарныя посьпехі якія, маюцца ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляюцца лепшым доказам правільнага вырашэньня камуністычнай партыяй нацыянальнага пытаньня, лепшым доказам вернасьці не прынцыпаў. Мы зьяўляемся сьведкамі нячуванага росквіту ўсіх нацыянальнасьцяй, якія яднаюцца ў Саюз ССР, мы зьяўляемся сьведкамі таго, як братэрскім сужыцьцём розных нацый узмацняецца гаспадарча-культурны ўздым, у першую чаргу найбольш адсталых раней нацыянальнасьцяй.

Як прыклады тут можна паказаць і на Туркісіб, і на Днепрабуд, і на Заэс, і на Асінабуд, і на іншыя буйныя будовы, а таксама на разьвіцьцё культуры башкірскай ў Туркестане, на разьвіцьцё прамысловасьці на Каўказе, асушку балот у БССР і інш.

Гэта сьведчыць аб тым, што вырашэньне нацыянальнага пытаньня магчыма толькі пасьля пераможнай пралетарскай рэвалюцыі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту. Дзякуючы правільнаму вырашэньню нацыянальнага пытаньня, якое «ёсьць частка агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюцыі, частка пытаньня аб дыктатуры пралетарыяту» (Сталін), раней адсталыя і забітыя акраіны ператварыліся зараз у квітнеючыя савецкія рэспублікі з вельмі моцнай эканомікай.

Саюз ССР аказвае і аказвае ўсім нацыянальным рэспублікам вельмі моцную падтрымку, а гэта ў сваю чаргу забясьпечвае высокія тэмпы разьвіцьця нацыянальнай культуры.

Па тых выніках сацыялістычнага будаўніцтва, якія ёсьць за гэты час у паасобных савецкіх рэспубліках, працоўныя ўсяго сьвету могуць бачыць, як можа шматнацыянальная пралетарская дзяржава квітнець і разьвівацца на падставах поўнага давер'я, узаемнай салідарнасьці і рэвалюцыйнага сацыялістычнага супрацоўніцтва.

У царскія часы беларусы, як асобная нацыянальнасьць з сваёй асобнай нацыянальнай мовай, адмаўляліся царскім урадам, які ўвесь час разглядаў Беларусь як звычайную царскую губэрню. Ад гэтага вынікала і тая палітыка, якая ў адносінах да беларусоў ажыцьяўлялася царскім урадам. Апошні забараняў для карыстаньня беларускую мову ў дзяржаўных установах, школах і г. д., забараняў адчыненьне беларускіх школ, газэт, часопісаў і г. д. Па сваёй пісьменнасьці беларусы займалі адно з апошніх месц у складзе царской Расіі. Беларусь таксама ня мела ніводнай вышэйшай навучальнай установы і вельмі нязначную колькасьць сярэдніх і ніжэйшых школ. Прамысловасьць і сельская гаспадарка былі значна менш разьвіты ў Беларусі чым у іншых частках царскай Расіі.

Зруйнаваная імпэрыялістычнай вайной, акупацыямі і бандытызмам, народная гаспадарка БССР была адноўлена да яе даваеннага ўзроўню ў 1926-27 г. Распачаўшы разам з іншымі саюзнымі рэспублікамі плянавае будаўніцтва, БССР пабудавала сваю пяцігодку, якая зараз з вялікімі посьпехамі выконваецца ў 4 гады, а па іншых галінах народнай гаспадаркі і ў больш кароткі тэрмін.

Пад правільным кіраўніцтвам камуністычнай партыі прамысловасьць БССР ужо зараз адыгрывае вядучую ролю ў сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі. Дзякуючы гэтаму значна пашырылася пралетарская база і яшчэ больш узмацнілася кіруючая роля пралетарыяту ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве. У БССР, як і ў іншых савецкіх рэспубліках, ліквідавана беспрацоўе.

Агромністыя посьпехі сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны забясьпечылі рашучы паварот бядняцка-серадняцкіх мас сялянства да сацыялізму і пераход на новыя формы сацыялістычнага земляробства, на калектыўныя формы і пашырэньне саўгаснага сэктару, яго вядучай ролі у сельскай гаспадарцы.

У працэсе выкананьня заданьняў першых двух год пяцігодкі пралетарская рэвалюцыя ўступіла ў новую фазу свайго разьвіцьця і перайшла да разгорнутага рашучага наступленьня сацыялізму на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце. Ад палітыкі абмежаваньня і выцясьненьня капіталістычных элемэнтаў мы ўжо перайшлі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Перабудоўваючы народную гаспадарку на сацыялістычны лад, БССР да сягнула агромністых посьпехаў і на фронце культурнага будаўніцтва. У 1930 годзе на культурнае будаўніцтва было выдаткавана, напрыклад, 80 млн. руб., а ў 1931 годзе будзе выдаткавана 128 млн. руб. БССР зьяўляецца першай з саюзных рэспублік, якая ўвяла ў сябе ўсеагульнае абавязковае навучаньне. У 1931 годзе ў асноўным заканчваецца ліквідацыя нябісьменнасьці. Значна разгарнулася сетка сярэдніх і вышэйшых навучальных установ па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў для розных галін гаспадаркі і культурна-савецкага будаўніцтва. Ужо зараз БССР мае 13 вышэйшых школ, 81 рабфак, 31 тэхнікум, рад навукова-дасьледчых устаноў, якія вядуць сваю работу ў галіне прыроды і гаспадаркі БССР. Культурна-асьветныя установы БССР абслугоўваюць нацыянальнасьці на іх роднай мове. З усіх школ-сямігодак у БССР беларускіх школ ёсьць 73 проц., яўрэйскіх—17 проц., польскіх—3 проц., расійскіх—6 проц., іншых—1 проц. Ёсьць тэхнікумы, прафшколы, фабзавучы, ад дзяленьні на рабфаках, пэдфаку і г. д. на нацыянальных мовах. На чале культурнага будаўніцтва стаіць Беларуская Акадэмія Навук. На нацыянальных мовах ёсьць ня толькі школы, тэатры, але і буйныя выдавецтвы на нацмовах, нацыянальныя газэты, саветы, існуюць нацыянальныя калгасы і г. д.

Тыя дасягненьні, якія БССР мае ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляюцца вынікам правільнага кіраўніцтва камуністычнай партыі, вынікам правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, вынікам значнай дапамогі, якую Саюз ССР аказваў і аказвае ўсім раней адсталым нацыянальнасьцям.

Адзначаючы дзень Канстытуцыі Саюзу ССР, трэба напомніць адно месца ў Дэкларацыі аб утварэньні Саюзу ССР, якое кожны дзень сьцьярджаецца самім жыцьцём, іменна тое, што аб'яднаньне савецкіх рэспублік у адну савецкую дзяржаву патрабуецца для забясьпечаньня ад ўнешняй небясьпекі і ўнутраных гаспадарчых посьпехаў, а таксама для свабоды нацыянальнага разьвіцьця ўсіх нацый, што жывуць на тэрыторыі Саюзу ССР.

У Камісіі Выкананьня

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Пра арганізацыю працы ў калгасах у часе ўборачнай кампаніі

Выслухаўшы даклад старшыні Белкалгасцэнтру т. Міцькова пра арганізацыю працы ў калгасах у час уборачнай кампаніі, Камісія Выкананьня лічыць устаноўленым, што сучасная арганізацыя працы ў калгасах і падрыхтаванасьць да ўборкі ўраджаю не забясьпечвае своечасовага правядзеньня ўборачнай кампаніі. Не забясьпечан яшчэ падлік працы калгасьнікаў у працаднёх, не ва ўсіх калгасах распрацаваны нормы выпрацоўкі па ўборцы асобных культур, у большасьці калгасаў не складзены яшчэ рабочыя пляны ўборкі і не арганізаваны ўборачныя брыгады.

Выходзячы з гэтага Камісія Выкананьня пастанаўляе:

1. Абавязаць Белкалгасцэнтр пад адказнасьць тав. Міцькова, Упаўнаважанага Трактарасцэнтра пад адказнасьць т. Каршакевіча Райкалгасаюзы пад адказнасьць старшыні і машына-трактарныя станцыі пад адказнасьць дырэктароў:

а) арганізаваць правядзеньне ўборачнай кампаніі выключна на аснове зьдзельшчыны па ўсіх відах работы, давёўшы да кожнае брыгады і калгасьніка канкрэтныя заданьні па ўборцы і забясьпечыўшы правядзеньне ўборкі ў вызначаны тэрмін;

б) не пазьней 15 ліпеня забясьпечыць усіх калгасьнікаў працоўнымі кніжкамі, робячы запісы працадзён згодна выпрацоўкі кожнага калгасьніка не радзей як кожныя 5 дзён.

в) забясьпечыць складаньне рабочых пляноў ва ўсіх калгасах не пазьней 15 ліпеня.

2. Улічваючы вялікую напружанасьць з рабочай сілай у шэрагу спэцыялізаваных калгасаў, абавязаць Райкалгасаюзы скласьці балянсы рабочае сілы па кожнаму ў паасобку калгасу і арганізаваць своечасовую дапамогу людзьмі, цягавай сілай і машынамі тым калгасам, якія менш імі забясьпечаны.

3. Абавязаць РВК пад адказнасьць старшынь:

а) практычна дапамагчы райкалгасаюзам і МТС у справе арганізацыі працы ў калгасах.

б) аслабаніць работнікаў і спэцыялістых райкалгасаюзаў і МТС на час падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі ад работ не зьвязаных з падрыхтоўкай і правядзеньнем апошняй.

4. Улічваючы вялікі недахоп у спэцыялістах для складаньня рабочых пляноў—даручыць старшыням райкалгасаюзаў дагаварыцца з мясцовымі арганізацыямі саюзу працасьветы аб прыцягненьні настаўнікоў да практычнага ўдзелу ў складаньні рабочых пляноў у калгасах.

5. Абавязаць Белкалгасцэнтр, старшынь райкалгасаюзаў і загадчыкаў раённых аэмельных аддзелаў ужыць патрэбныя захады для арганізацыі ў калгасах бытавых устаноў у мэтах стварэньня ўмоў для больш поўнага скарыстаньня жаночай працы ў час уборкі.

Прапанаваць Белкалгасаюзу забясьпечыць бытавыя установы, якія арганізуюцца ў калгасах належным абсталяваньнем.

6. Даручыць РКК-РСІ прасачыць за разгортваньнем работы па падрыхтоўцы калгасаў да ўборкі.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР М. Галадзед.

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. Элькін.

29 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Неадкладна ліквідаваць

адсталыя вучасткі пазыковай кампаніі ў горадзе

Рэалізацыю пазыкі ў вёсцы скончыць да пачатку ўборкі Ударнікі сацыялістычных палёў Савецкай Беларусі, пакажэце свой прыклад на справе

Падпіска разгортваецца

Падпіска на пазыку «3-ці рашаючы» на Кругляскім раёне разгортваецца па-ўдарнаму. Праведзены масавыя сходы партыйных і камсамольскіх арганізацый, якія вызначылі шлях і мэтады работы па рэалізацыі новай пазыкі.

Падпіска па ўстановах амаль закончана. Працаўнікі райкаапсаюзу і райкалгасаюзу на сваім сходзе падпісаліся на 110 проц. свайго заработку. Працаўнікі міліцыі і ДПУ падпісаліся на 100 проц. месячнага заработку і аб вясьцілі выплату пазыкі скончыць у 5 месяцаў. Працаўнікі РК КП(б)Б, РК ЛКСМ і РКК падпісаліся на суму звыш 1.300 руб. Рабочыя саўгасу Цяцерына падпісаліся на пазыку на месячны заработак. Уся работа праходзіць з шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва

Шырока разгарнулася падпіска сярод камсамольцаў калгасных ячэек. Райкомам ЛКСМ арганізавана буксірная брыгада па выкананьні заданьняў мабілізацыі сродкаў. Ясна-Палянская ячэйка падпісалася на суму 315 руб., Літоўская—на 100 руб., кожная ячэйка ўхваліла пастанову аб тым, каб кожны камсамолец завербаваў ня менш 6 падпішчыкаў і ня менш чым на 5 руб. кожнага. Дарожкаўская ячэйка распачала масавую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і моладзі.

Разам з гэтым трэба адзначыць рад недапушчальных зьявішчаў в падпіскай на першую пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады». Калгас «Чырвоны», які падпісаўся на 100 руб., ня ўнёс ніводнай капейкі. Па Ўсім Паўлавіцкім сельсавеце унесена толькі 75 руб.

Пад кіраўніцтвам партыі калгасьнікі Кругляншчыны зламаюць бязьдзейнасьць асобных калгасаў і сельсаветаў і дадуць 100-процантную падпіску на пазыку.

Брыгадны.

Калгасьніцы ў першых радох

Лепель. (БЕЛТА). Пачалася падпіска на пазыку «3-га рашаючага» ў калгасах. Падпіска праходзіць з вялікім уздымам. Калгасьніцы калгасу «Зарава» падпісаліся на паўмесячны заробак. Калгасьніцы замест 850 руб. па заданьні, далі 1.400 руб. і выклікалі на спаборніцтва калгас «Чырвоны Лепель». Выклік прыняты. Жанчыны калгасу «Чырвоны Лепель», не адстаюць у падпісцы ад мужчын, якія падпісаліся на месячны заробак. Выклікалі на сацспаборніцтва жанчын калгасу «Барэц Волі».

Першымі ўнесьлі ўзносы

Бабруйск. (БЕЛТА). Калгасы «Чырвоная Ніва», «Энэргія», «Першае Мая», «Мэркуры», «Камінтэрн», «Пераможца»—першымі па раёне распачалі падпіску на пазыку «3-га рашаючага», даючы трохтыднёвую і месячную выпрацоўку. Калгасы «Энэргія» і «Пераможца» першымі ўнесьлі ўзносы на пазыку.

Толькі на 80 проц.

Полацак. (БЕЛТА). Кантрольнае заданьне па падпісцы на пазыку «3-га рашаючага» горадам выканана на 80 проц. Ганебна адстаюць чыгуначны вузел, цагельны завод, парад 2 і калактыў ЦРК. У вёсцы работа па рэалізацыі пазыкі амаль не распачата. Раённая камісія садзейнічаньня разгортваньню пазыкі працуе слаб.

На 100 процантаў

Віцебск. (БЕЛТА). Стралкі палітканманды, склад аховы чыгункі МББ усе ахоплены падпіскай на пазыку. Усе ахоплены падпіскай на пазыку «3-га рашаючага» на 100 % месячнага заробку. Размешчана пазыкі 54.620 руб. пры месячным заробку ў 52.700 руб.

На 30 працадзён

Гомель. (БЕЛТА). У вёсках Гомельшчыны разгортваецца падпіска на пазыку «3-га рашаючага». Калгасьнікі пазыку «3-га рашаючага» амаль усюды на 30 працадзён. Клгасы «Чырвоны Хлебаробі» і «Камунар» скончылі рэалізацыю кантрольнай лічбы, ахапіўшы ўсіх калгасьнікаў на 30 проц. Ініцыятары падгасьнікаў на 30 проц. Ініцыятары падпіскі ў калгасе «Камунар» т. т. Янка, Бартна, Тоні, Пётра Клімовіч, Янка Шыцікаў—падпісаліся звыш 30 працадзён. Канчае падпіску саўгас імя Ландге, дзе 2-га ліпеня падпіска дасягнула да 98 проц. месячнага заробку.

Наперадзе па падпісцы ідуць члены Цярвінскаўскага сельсавету, якія першымі правялі падпіску. На пленуме гэтага сельсавету прынята рашэньне актыўна змагацца за выкананьне кантрольнай лічбы.

У Жлобіне недастаткова змагаюцца за пазыку

Жлобін. (БЕЛТА). Рэалізацыя пазыкі «3-га рашаючага» па Жлобінскім раёне праходзіць вельмі марудна. На 1-е ліпеня горад Жлобін, заданьне выканаў на 87 проц. Ахоплена падпіскай рабочых усяго на 65 проц. Рад калактываў плятуцца ў хвасьце і не афармляюць падпіскі (РТПО, Леспрамгас, прыгарадныя гаспадаркі і інш.). Упоравае ідуць калактывы чыгункі, дзе кантрольная лічба ў 502.450 руб. выканана на 100 проц. За ёй ідуць райміліцыя—123 проц. Ганебна адстаюць калактыў РВК і бюджэтныя установы, якія сваё заданьне ў суме 24.000 руб. выканалі на 20 проц. Дрэнна абстаіць справа з падпіскай сярод сэзоньнікаў і неарганізаванага насельніцтва.

Па гарадох і раёнах

У саўгасе імя «Лекерта» рэалізацыя пазыкі «3-га рашаючага» разгорнута слаба.

За 19-VI-31 г. толькі 85 лепшых рабочых падпісаліся на 100 проц. месячнага заработку з агульнага ліку 100 штатных рабочых. Сярод нацменшасьцяй (немцаў) падпіскай ахоплена 1 чал. з ліку каля 80 чал., значная частка сэзоньнікаў і падзёншчыкаў зусім неахоплена пазыкай.

Але і зараз сярод адсталых у падпісцы ніякай растлумачальнай работы не праводзіцца ні рабкомам, ні партыйнай, ні камсамольскай ячэйкамі. Нават яя ўсе камсамольцы падпісаліся на пазыку «3-га рашаючага году пяцігодкі».

Ударнік.

Рабочыя, служачыя і тэхнэрсанал Віцебскага леспрамгасу датэрмінова пагасілі запазычанасьць па пазыцы «5-ці годка ў чатыры гады» і падпісаліся на новую пазыку «3-га рашаючага» у разьмеры месячнага заработку. Калектыў леспрамгасу ўзяў на сябе абавязацельства садзейнічаць пасьпяховаму правядзеньню пазыкі «3-га рашаючага» сярод сэзоньнікаў працуючых на лесазагатоўках і сплаве.

Віцебскі леспрамгас выклікаў на сацспаборніцтва па рэалізацыі пазыкі Гарадоцкі, Бешанковіцкі, Полацкі леспрамгасы і Заходняя — Дзьвінскум Сплаўкантору.

Говес.

Працаўнікі міліцыі Пухавіцкага раёну падпісаліся на пазыку «3-га рашаючага» у разьмеры 130 проц. месячнай зарплаты і абвясьцілі сябе ўдарнікамі па правядзеньні масавага растлумачальнай работы па рэалізацыі пазыкі сярод калгасьнікаў і адназасобнікаў. Калектыў працаўнікоў міліцыі ўзяў на сябе абавязак рэалізаваць сярод працоўнага сялянства і калгасьнікаў ня менш як на 200 руб. кожным працаўніком і выклікаў на сацспаборніцтва па распаўсюджваньні пазыкі калектывы Нарсуду, Райвыканкому і Саюзу Мэдсанпрацы.

У бой за торф

Зрух зроблен, але недастатковы

Дзенная здабыча за 3-VII-31 году дала 50,9 проц. Яшчэ вышэй тэмпы здабычы

Ударыць па канкрэтных носьбітах зрыву

Калі на тарфяных масывах атрымаўся прарыў, партыя ня толькі мабілізавала савецкую грамадзкасьць на выкананьне тарфянога пляну, але сама мабілізавалася на гэты фронт. Паслана 500 камуністаў-ударнікаў з фабрык і заводаў, камсамол мабілізаваў 1.000 камсамольцаў на торфазаводы.

Прафсаюзы і спажыўцы торфу павінны былі неадкладна ўзяць шэфства над торфазаводамі і кінуць усю вольную сілу на дапамогу торфазаводам.

Але нажаль і да сёньняшняга дня амаль-што ніводзін саюз і ніводзін спажывец гэтага не зрабілі.

Лічбы, якія мы маем па выкананьні пляну на 1-га ліпеня, гаворадь аб тым, што каляндарны плян выпрацоўкі выкананы на 33,6 проц., сэзонны плян на 16,2 проц. Гэта яшчэ раз прымушае нас біць трывогу. Тут няма «аб'ектыўных умоў» для такога ганебнага адставаньня. Ёсьць «суб'екты», якія ня адольны выканаць дырэктывы партыі і ўраду, галавацяпы, якія арыгінуюць работу.

Узяць завод «Калектыўная праца». Калі школа ФЗУ дабраахвотна арганізуе суботнік для дапамогі ліквідацыі прарыву і сваімі сіламі ставіць спэктакль і канцэрт для рабочых, працуюць цэлы дзень па здабычы торфу, дык у часе абеду дырэктар Новікаў у п'яным відзе крычыць на вучняў:

— Вы больш пажроце, чым напрацуеце!

Як выканаў гэты завод свой плян? На 1-га ліпеня каляндарны плян выкананы ўсяго на 11 проц., сэзонны плян на 5,5 проц.

Такі Новікаў не адзін, такіх Новікавых шмат. Іх трэба гнаць з торфазаводаў і замяняць работнікамі, якія здольны выканаць дырэктывы партыі і ўраду.

Але-ж гэта ня зьнімае адказнасьці з мясцовых, партыйных і прафсаюзных арганізацый за выкананьне прамфінпляну.

Спажыўцы торфу павінны зараз-жа арганізаваць дапамогу торфазаводам шляхам вылучэньня ўсіх магчымых вольнай рабочай сілы, арганізуючы суботнікі на ліквідацыю прарыву на торфяным фронце.

Гольдвасэр.

Рэктар БДУ Каранеўскі

Буйнейшая перамога на фронце культурнай рэвалюцыі

(Да 10 годзьдзя БДУ. 1921—1931 г.)

Беларускі Дзяржаўны Ўнівэрсытэт, які быў адкрыты ў гор. Менску 11 ліпеня 1921 г., у першую гадавіну вызваленьня БССР ад панскай беларольскай акупацыі,—ёсьць дзіця Вялікай Кастрычнікавай Рэвалюцыі. Толькі дзякуючы пралетарскай рэвалюцыі, арганізаванай і кіруемай ленінскай камуністычнай партыяй бальшавікоў, пры неаслабнай заўжднай дапамозе рабочае клясы СССР, працоўных масы Савецкай Беларусі маюць на сёньняшні дзень 12 ВНУ і ВТНУ і ў гэтым ліку Беларускі Дзяржаўны Ўнівэрсытэт.

Да кастрычніканай рэвалюцыі на Беларусі не існавала ніводнай вышэйшай навучальнай установы.

Памешчыцка - буржуазнаму ўраду былой царскай Расіі, у складзе якой Беларусь была на палажэньні калёніі ня выгадна было ўтвараць у Беларусі вышэйшую школу. Царскі ўрад на працягу стагодзьдзя нажэроўваў у Беларусь надзейных для сябе людзей, чыноўнікаў усіх рангаў не для вывучэньня эканомікі краю і падняцьця прадукцыйнасьці сіл, не для падняцьця культурнага ўзроўню працоўнага насельніцтва Беларусі, а для таго, каб весьці бязьлітасную эксплёатацыю рабочых і ўсяго працоўнага насельніцтва Беларусі, для таго, каб цьвёрда і рашуча праводзіць русіфікацыю краю, трымаць працоўных у нявольніцтве і цемры.

Да гэтага букету чорнасоценцаў, пра цаваўшых у якасьці спэцыялістаў у Беларусі пры царызьме, трэба дадаць і групу мясцовай буржуазнай і дробна-буржуазнай беларускай нацыянал-дэмакратычнай інтэлігенцыі—гэтых за клятых ворагаў Савецкай улады з першых дзён Кастрычнікавай рэвалюцыі—тыпу Лёсіка, Смоліча, Цьвікевіча, Ластоўскага, Луцкевіча, Астроўскага і К-°.

Пасьля акупацыі Беларусі (нямецкай, белапольскай) тут засталася пэўная колькасьць спэцыялістаў і інтэлігенцыі, адданых савецкай ўладзе, якіх рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, скарыстоўвае для сацыялістычнага будаўніцтва.

Усё гэта было ўлічана кампартыяй і савецкай уладай з самага пачатку існаваньня БССР і на падставе гэтага была пастаўлена ва ўсёй сваёй вялізарнасьці праблема падрыхтоўкі сваіх пралетарскіх высока-кваліфікаваных кадраў для ўсіх галін сацыялістычнай гаспадаркі, кадраў, выходзячых з асяроддзя рабочых і працоўнага сялянства, асноўнага насельніцтва ўсіх нацыянальнасьцяй Савецкай Беларусі.

Умовы для адкрыцьця ўнівэрсытэту ў Менску былі досыць цяжкія. Ня было навуковых сіл, адсутнічала спэцыяльнае памяшканьне, абсталяваньне. Ня гледзячы на ўсё гэта, дзякуючы рашучым натугам КП(б)Б, органаў савецкай улады і рэвалюцыйнага энтузіязму рабочае клясы, дзякуючы братэрскай дапамозе пралетарыяту СССР цяжкасьці якія стаялі на шляху арганізацыі БДУ былі пераможаны. Наркамасьветы РСФСР вылучыў і прыслаў для работы ў БДУ моцнае ядро з высокакваліфікаваных навуковых работнікаў. Для работы ў БДУ былі прыцягнуты і ўсе мясцовыя сілы, якія можна было выкарыстаць. Гарсаветам былі перададзены ўнівэрсытэту рад памяшканьняў і бальніцы для яго клінікі.

Увесь пэрыяд часу з канца 1920 г. да канца 1921 г. пад кіраўніцтвам КП(б)Б і пры самай шырокай дапамозе з боку рабочае клясы ўсяго Савецкага Саюзу быў скарыстаны Савецкімі органамі БССР для вырашэньня чарговых арганізацыйных пытаньняў па ўтварэньні Ўнівэрсытэту.

11 ліпеня 1921 г., у дзень вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў, адбылося ўрачыстае адкрыцьцё БДУ, а ў кастрычніку 1921 г. пачаліся навучальныя заняткі. Унівэрсытэт пачаў функцыянаваць у складзе наступных факультэтаў: рабочага, грамадзкіх навук і мэдычнага. Замест сельска-гаспадарчага факультэту пры Ўнівэрсытэце ў 1922 г. быў адкрыты самастойны сельска-гаспадарчы інстытут у Менску і ў Горках. Пазьней гэтыя два інстытуты былі злучаны ў Горацкую сельска-гаспадарчую Акадэмію.

За 10 год свайго існаваньня БДУ правёў рад структурных рэарганізацый. У 1929-30 акадэмічным годзе унівэрсытэт складаўся з 6 факультэтаў—рабочага, мэдыцынскага, пэдагагічнага, народнай гаспадаркі, хіміка-тэхналёгічнага і савецкага будаўніцтва і права.

У пачатку 1930-31 навучальнага году мэдыцынскі і хіміка-тэхналёгічны факультэты былі вылучаны са складу Унівэрсытэту ў самастойныя інстытуты.

За 10 год свайго існаваньня Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт ператварыўся ў адзін з апорных пунктаў культурнага сацыялістычнага будаўніцтва БССР, у адну з буйных вышэйшых навучальных устаноў Савецкага Саюзу. Зараз пры Ўнівэрсытэце ёсьць Вячэрні Рабочы Унівэрсытэт, антэрэлігійны ўнівэрсытэт, завочны і вячэрні пэдфак.

Пад кіраўніцтвам партарганізацыі Ўнівэрсытэту вядзецца рашучая сыстэматычная барацьба за пралетарызацыю БДУ. З агульнай колькасьці прынятых ў апошнім навучальным годзе рабочыя і іх дзеці складаюць 50 проц., сяляне (калгасьнікі, беднякі і сераднякі) —30 проц., служачыя—20 проц.). Партыйна-камсамольскі склад раўняецца 70 проц.

Вядзецца сыстэматычная ачыстка студэнцтва ад чужых і варожых элемэнтаў. Нацыянальны склад студэнцтва Ўнівэрсытэту ў 1930 г. наступны: беларусоў—60 проц., яўрэяў—30 проц., рускіх, палякаў, украінцаў і інш:—10 проц: значна павялічылася партыйна-камсамольская праслойка ў складзе студэнцтва: Для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных работнікаў для абслугоўваньня нацменшасьцяў—на рабфаку і пэдфаку існуюць яўрэйскае і польскае аддзяленьні.

Сярод малодшага складу навуковых работнікаў (асыстэнты і асыпіранты) беларусоў—61 проц., яўрэяў—36 проц., іншых—3½ проц.

Партарганізацыя БДУ пры дапамозе Менскай гарпартарганізацыі ,пад кіраўніцтвам усёй КП(б)Б праводзіла ўвесь час рашучую барацьбу з усялякімі ўхілямі ад ленінскай нац. палітыкі—з правымі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму як галоўнай небясьпекі, беларускім контрэвалюцыйным нацдэмакратызмам, яўрэйскім і польскім і інш. шавінізмамі.

Выкрытыя носьбіты вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму (праф. Шчапоцьеў, Вазьняясенскі) сустрэлі рашучы адпор ад усёй унівэрсытэцкай грамадзкасьці і былі выняты з работы. Група беларускіх контррэвалюцыйных нацдэмаў (Лёсік, Смоліч, Красоўскі, Трамповіч), будучы выкладчыкамі ў БДУ, імкнуліся атакаваць БДУ і разгарнуць у ім сваю контррэвалюцыйную справу па падрыхтоўцы з сацыяльна-чуждай і варожай нацыяналістычнай часткі студэнцтва сваіх нацдэмаўскіх кадраў. Аб гэтым сьведчаць «Ліст трох пісьменьнікаў» (Зарэцкі, Дудар, Александровіч), нацдэмаўская вылазка Марука, Ільлічоўка у час партыйнай чысткі заява студэнтаў «Узвышаўцаў», абараняўшых «Ліст 3 пісьменьнікаў». Скончыўшыя БДУ ў 1925-26 г. г. Апацёнак, Белькевіч, Чаржынскі, Кіпель, Каравайчык, Забела, Бурдзейка і інш. апынуліся ў лягерах беларускіх контррэвалюцыйных нацдэмаў.

Мелі месца ў БДУ таксама і праявы яўрэйскага шавінізму і нацдэмакратызму (праф. Єосіс).

За апошнія 3 гады партарганізацыяй і кіраўніцтвам БДУ праароблена была вялікая праца па сыстэматычнай чысткі студэнцтва БДУ ад кулацкіх, нэпманскіх і іншых сацыяльна-чуждых і варожых элемэнтаў, якімі доўгі час засьмечан быў Унівэрсытэт, дзякуючы ленінскай палітыцы былога НКА Баліцкага і яго спадручных—нацдэмаў С. Некрашэвіча (загадваў пры Баліцкім Галоўпрафобрам, а пасьля Галоўнавукай) і праф. Пічэты (быў рэктарам на працягу 8-мі год).

У выніку ўпартай барацьбы за чыстату Марксыцка-Ленінскай мэтодолёгіі ў выкладаньні, у выніку чысткі студэнцтва ад сацыяльна-чуждых і варожых элемэнтаў, у выніку рашучага змаганьня за пралетарызацыю БДУ—за апошнія 2-3 гады было выяўлена і зьнята з працы за анты-марксыцкую адэалёгію, вялікадзяржаўны расійскі шавінізм, беларускі нацдэмакратызм і шавінізмы іншых колераў—каля 30-ці навуковых працаўнікоў, убрана звыш 200 чужых і варожых элемэнтаў сярод студэнцтва.

Пільны клясавы адбор пры прыёмах студэнтаў за апошнія гады і пры апрашэньні навуковых працаўнікоў на працу, забясьпечылі значныя посьпехі ў барацьбе за пралетарызацыю студэнцтва і пралетарскую ідэолёгічную вытрымананасьць сярод значнай часткі навуковых працаўнікоў ва Унівэрсытэце.

БДУ мае таксама вялікія дасягненьні ў справе беларусізацыі. Рабфак беларусізаваны поўнасьцю, усе дысцыпліны чытаюцца на беларускай мове. На іншых факультэтах беларусізавана каля 75 - 80 проц.

Пад кіраўніцтвам парткалектыва Бел. Дзяржк. Унівэрсытэт з мясцовага асноўнага працоўнага насельніцтва—рабочых, батракоў, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкай часткі сялянства БССР з вялікімі посьпехамі выконвае важнейшую задачу па падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў з марксыцка-ленінскім сьветапоглядам для сацыялістычнага будаўніцтва ў розных галінах народнай гаспадаркі, пралетарскай культуры і савецкага будаўніцтва.

Перад намі ва ўвесь рост стаіць праблема кадраў у рэканструкцыйны пэрыяд разьвіцьця народнай гаспадаркі. Гэты пэрыяд з усёй вострасьцю і рашучасьцю ставіць пытаньне як аб колькасьці новых спэцыялістаў, так і аб іх якасьці» (лістападаўскі пленум ЦК Усе КП(б).

Унівэрсытэт мае ў сучасны момант добра падрыхтаваныя ў сваёй большасьці марксыцка-ленінскія навуковыя сілы, багацейшыя вялізарнейшыя новыя будынкі (Унівэрсытэцкі гарадок), надзвычайна добра абсталяваныя спэцыяльныя лябараторыі (інстытуты, габінэты, бібліятэкі), захоплене энтузіязмам сацыялістычнага будаўніцтва пралетарскае студэнцтва амаль пагалоўна ўцягнутае ў сацспаборніцтва і ўдарніцтва, магутную ядаровую партыйную і камсамольскую арганізацыю.

Студэнтам БДУ праведзена апрамадная работа па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод рабочых і працоўнага насельніцтва г. Менску. Арганізавана было некалькі курсаў па падрыхтоўцы рабочых у вышэйшыя школы. Студэнты старэйшых курсаў выкладалі ў вячэрнім рабочым Унівэрсытэце, у партшколах і гуртках на прадпрыемствах горада. Студэнцкія арганізацыі па факультэтах праводзяць культшэфства над рабочымі прадпрыемствамі і калгасамі па вёсцы, а таксама сяброўць з часьцямі Чырвонай арміі.

Шляхам актыўнага ўдзелу ў гаспадарча-палітычных кампаніях і шляхам правядзеньня 40 про

ПА-УДАРНАМУ ПРАВЕСЬЦІ ПРАПОЛКУ

Калгас „Першамайск“ скончыў праполку лёну

Зьдзельшчынаю і правільным вучотам працы на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў праполачнай павялічым ураджай

Сваячасовай праполкай і добрым доглядам павялічыць ураджай кораньплодаў

(Летні аграмінімум у пасевах кораньплодаў і бульбы)

Добра выраблене і ўгноєнае поле пад кораньплоды і бульбу яшчэ не дае поўнае гарантыі ў тым, што будзе атрыман высокі і добры ўраджай. Ураджай кораньплодаў на 75 проц. залежыць ад догляду за імі.

Сучасная тэхніка с-г вытворчасьці ўладае цэлым радам сродкаў, пры дапамозе якіх можна стварыць больш спрыяючыя ўмовы росту кораньплодаў у час іх разьвіцьця і тым самым садзейнічаць падвышэньню іх ураджаю ў саўгасах і калгасах.

Догляд за кораньплодамі, як аграмічны мінімум у летні час, складаецца з наступнага:

Калі адразу пасьля засеву кораньплодаў ідуць вялікія дажджы, дык на глебе стварацца скарынка, якая надта перашкаджае ўсходам кораньплодаў. Стварэньня гэтае скарынкі ні ў якім разе дапусьціць нельга. Як толькі заўважана, што яна стварылася, заразжа трэба прыняць адпаведныя захады, каб яе зьнішчыць. Зьнішчацца яна проста. Калі не зьявіліся яшчэ ўсходы,—можна пусьціць у 1—2 сьляды барану, а калі гэтая скарынка стварылася пасьля зьяўленьня ўсходаў, то можна пусьціць конны плянэт з грабельнымі часткамі.

Тыдні праз два пасьля ўсходу, калі расьліна мае 4—5 лісткоў, неабходна зрабіць першае прарэджваньне расьлін у радках, пры гэтым адначасова расьліна і праполваецца. Прарэджваньне і праполка — надзвычайна важная справа, бо пры густым засеве вырасьце многа бацьвіньня, але мала кораньплодаў. Прарываць патрэбна так, каб у радку расьліна ад расьлінны стаяла на 30—35 см. (буракі, турнэпс, бручка, а морква—15—20 см.). Раней за ўсё трэба рабіць прарэджваньне буракоў, потым ужо можна брацца за турнэпс, бручку і пазьней за ўсё—моркву. Асабліва сьпяшацца з прарэджваньнем турнэпсу і бручкі ня трэба таму, што ня нападае земляная блыха. Прарэджваньне можна рабіць толькі тады, калі лісьце гэтых расьлін зробіцца грубым і ня будзе баяцца блыхі.

Пасьля прарэджваньня неабходна сачыць, каб поле не зарастала пустазельлем, а таксама каб не стваралася скарынкі. У такіх выпадках па меры патрэбы неабходна пушчаць палольнікі-плянэты і інш. для праполкі расьлін і разрыхленьня скарынкі.

Праз тры тыдні пасьля першага прарэджваньня часта патрэбна бывае зрабіць яшчэ раз прарэджваньне, але гэта ўжо зьвязана з патрэбнасьцю лішніх рабочых рук, а таму карысьней прарэджваньне замяніць на прарыхленьне. Гэтым у значнай меры зьнішчацца пустазельле, а затрачаная работа, паводле даных дасьледчых устаноў, аплачваецца падвышэньнем ураджаю.

Калі лісьце суседніх радкоў злучыцца, тады ўжо можна спыніць усякі догляд за кораньплодамі, апрача толькі выпадкаў зьяўленьня шкоднікаў і хвароб. У гэты час звычайна кораньплоды настолькі набіраюцца сілы, што пачынаюць прыгнятаць пустазельле і толькі адзін асот можа разьвівацца разам з кораньплодамі. У такіх выпадках асот патрэбна выполваць і не даваць яму папыраца на вялікую плошчу.

Бручка, буракі, турнэпс і морква засаджваюцца як насеньнем, так і расадаю. Перасаджаную расаду трэба дагледаць і ў першую чаргу добра паліваць вадою. За бручкай, пасаджанай расадаю, трэба дагледаць гэтаксама, як і за пасаджанай насеньнем, г. зн. праполваць, рыхліць і матыкаваць пры дапамозе конных ці трактарных рыхлителяў, палольнікаў, акучнікаў і г. д. Калі лісьце пасобных радкоў злучыцца паміж сабою, дык яж да самае ўборкі ніякага догляду больш непатрэбна.

Уборку кораньплодаў можна пачынаць тады, калі ніжнія лісточкі адгнуцца да зямлі і пачнуць жаўцець. Абрываць лісты да ўборкі нямоўна таму, што ад гэтага значна зьніжэцца ўраджай. Трэба памятаць, што праз лісьце якраз і адкладаюцца спажыўныя матэрыі ў карані.

Уборка кораньплодаў робіцца або спэцыяльнай машынай, або пры дапамозе вілак, або рукамі. Моркву можна выворваць плугам.

Кораньплоды, выцягнутыя з зямлі, складаюцца ў невялікія кучкі кораньнямі ў сярэдзіну, а націньнем наверх. Адначасова з гэтым адна з уборачных брыгад пачынае абцінаць лісьце нажом, але так, каб лісьце не распадалася, а крыху трымалася за тонкі пласт мяккай галоўкі. Прыстаўшая зямля абчышчаецца тупым канцом ножа, але так, каб не папсаваць скурачкі кораньплода і мякіш. Такім чынам абчышчаныя кораньплоды складаюцца ў новыя кучкі для прасушвання, а націньне скарыстоўваецца для загатоўкі сілосу.

Бацьвіньне моркавы перад уборкай можна проста скошваць і вазіць у сіласныя ямы. Лісьце моркавы вельмі багата на спажыўныя матэрыі, і з яго атрымліваецца добры сілос.

Кораньплоды захоўваюцца або на полі ў капцох, ямах і траншэях, або пры сядзібе ў склепе.

А. Савельеў.

Вучот працы прапольшчыц. Калгас імя Тэльмана.

Калгас „Першамайск“ скончыў поліва лёну

Добры ўраджай тэхнічных культур дасьць магчымасьць у большай меры забясьпечыць сыравінаю тэкстыльную прамысловасьць.

Адной з мер барацьбы за лепшы ўраджай зьяўляецца дагляд і праполка пасеву лёну. Гэта аразумеў калгас «Першамайск», Чэрвеньскага раёну, які ўжо скончыў праполку ўсёй засеянай лёнам плошчы.

Наогул поліва гароднины і кораньплодаў, у калгасе набліжаецца да заканчэньня. Апроч таго, абагнана ўжо ледзь ня ўся бульба, якое маецца ў калгасе каля 100 га.

На праполцы працуе 2 жаночых брыгады з 40—45 жанчын. Уся работа праведзена на зьдзельшчыну, нормы не перавыконваюцца, прычым якасьць працы вельмі высокая. Посьпеху і добраякаснасьці калектыўнай працы вельмі паспрыяла ліквідацыя абасобленых засеваў калгасьнікаў, куды яны ўкладалі значную частку сваёй работы. Цяпер калгасьнікі бяруцца за работу яшчэ да званка. Дружная праца калгасьнікаў на калектыўным полі перамагае ўсе перашкоды.

Вучот працы наладжаны здавальняюча. Працоўныя кніжкі разданы; кожную пляцідзёнку рахункавод, са зьвестак старшых брыгадзіраў, запісвае выпрацаваную колькасьць працадзён у кніжкі.

П.

Поліва праводзім на аснове зьдзельшчыны

Камуна «Чырвоны Артылерыст», Полацкага раёну, веснавую сяўбу закончыла з перавыкананьнем пляну па тэхнічных культурах. У сучасны момант камуна шырока разгарнула падрыхтоўку да ўборачнай і праполачнай кампаніі. Складзены і абгавораны пляны правядзеньня ўборкі ураджаю, паводле якіх правільна расстаўлена скарыстанне рабочай і цягавай сілы. Арганізаваны ўдарныя брыгады па сенаўборцы, касьбе, поліве іншых галінах работы.

Брыгада жанчын ужо 20 чэрвеня прыступілі да поліва гароднины. На сёньняшні дзень значная частка гароднины праполата.

Адначасова з поліваем пачалася і касьба канюшыны і залёўных сенажацяй. Уся праца праводзіцца выключна на аснове зьдзельшчыны і ўлічваецца ў працаднёх. Тэмпы касьбы і поліва паказваюць, што камуна з уборкай справіцца.

Мікола Яроменка.

Выратаваць засевы ад лугавога матыля

У сучасны момант па ўсёй паўднёвай частцы СССР наглядаецца ў значнай колькасьці лёт лугавога матыля.

Лугавы матыль кладзе яечкі, з якіх праз 4—7 дзён выходзяць вусьні, якія, перапаўзаючы з расьліны на расьліну, зьнішчаюць (зьядаюць) усё на сваім шляху.

Летась лёт лугавога матыля назіраўся ў Хойніцкім, Брагінскім, Рагачоўскім, Жлобінскім і Вузьдзенскім раёнах. Зараз па зьвестках у БССР зноў пачынае зьяўляцца лугавы матыль, які прыносіць вялікія страты сельскай гаспадарцы. Так, у Гомельскай акрузе ён ужо зьявіўся.

Былая Гомельская акруга знаходзіцца на мяжы з Украінскай, адкуль пераходзіць лугавы матыль. У сувязі з гэтым магчыма чакаць зьяўленьня лугавога матыля ў Мазырышчыне.

Каб прасачыць за зьяўленьнем лугавога матыля і сваячасова ўжыць заходы проці яго, трэба ў кожным раёне арганізаваць наглядальныя пункты. Усе замельныя органы, машына-зьнішчальныя станцыі расьлінных шкодникаў і аб'яднаньні барацьбы са шкодникамі аб зьяўленьні лугавога матыля павінны тэрмінова паведамляць НКЗ або аддзяленьне АБШ (аб'яднаньне барацьбы са шкодникамі) і райасоавіяхімы—ЦС Асоавіяхім, каб сваячасова прыняць адпаведныя захады для зьнішчэньня шкодніка расьлін—лугавога матыля.

А. Маркавец.

Да першага ўсебеларускага зьезду ІТР будматар'ялаў

15 ліпеня г. г. адбудзецца першы Усебеларускі зьезд інжынэрна-тэхнічных работнікаў пры саюзе Прамбудматар'ялаў БССР.

Заводы, выробляючыя будматар'ялы, адчуваюць зараз у часе вострага не дахопу цэглы, вапны, чарапіцы і інш. вялікую ролю. Гэтым тыпаньнем зьезд павінен заняцца, гэта—галоўная мета зьезду.

Ліквідаваць прарыў па выкананьні прамфінпляну, даць будматар'ял сацыялістычнаму будаўніцтву, згуртаваць усіх ІТР навакол гэтых пытаньняў, падняць ініцыятыву мас,— вось тыя задачы, якія зьезд будзе абгаварваць і вырашыць, змагаючыся па бальшавіцку за першага ўсебеларускага зьезду ІТР прамбудматар'ялаў для таго, каб яго работа была карыснай і працаздольнай, каб зьезд даў патрэбныя вынікі.

Старшыня Аргбюро ІТС Саюзу Прамбудматар'ялаў БССР

Кацнэльсон.

Забясьпечым ураджай у прыгарадных гаспадарках

Віцебск, 2-VII. (Белта). Прэзыдыумам гарсавету і гарпрафсавету абвешчаны ўдарны пяцідзёнвік з 3-га па 8-га ліпеня па ліквідацыі прарыву па праполцы гароднины. На праполку прыгарадных гаспадарак мабілізуецца 40 пр. служачых савецкага і калгэрацыйнага апарату з выхадам ад працы за ку за гэты фронт нашай працы.

Усе ІТР на ўсіх заводах, мыбірайце вашых дэлегатаў на зьезд. Памятайце, што калектыўна абгаварыўшы пытаньне, нам лягчэй будзе выканаць намечаныя пляны, лягчэй будзе давесьці праграму да рашучага, пераможнага канца.

Цесна згуртуйцеся ўсе ІТР, прафсаюз і гаспадаркі навакол гэтага першага зьезду ІТР прамбудматар'яльшчынай для таго, каб яго работа была карыснай і працаздольнай, каб зьезд даў патрэбныя вынікі.

Старшыня Аргбюро ІТС Саюзу Прамбудматар'ялаў БССР

Кацнэльсон.

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

пра падрыхтоўку і ход уборачнай кампаніі па сыстэме Белсаўгастрэсту

Камісія Выкананьня пры СНК БССР адзначае, што ход падрыхтоўкі да ўборкі ў саўгасах Белсаўгастрэсту і сама ўборка (сенакашэньне і ўборка канюшыны) працякае павольнымі тэмпамі незабясьпечваючымі выкананьне гэтай важнейшай і адказьнейшай задачы саўгасаў.

Пры гэтым Камісія Выкананьня ўста наўляе, што:

а) Белсаўгастрэстам і адміністрацыяй большасьці саўгасаў зусім недастаткова мабілізавана рабочая маса і грамадзкасьць саўгасаў на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб поўным і сваячасовым правядзеньні ўборачнай кампаніі;

б) Белсаўгастрэст і большасьць дырэктароў саўгасаў ня ўжылі сваячасовых захадаў да максымальнай мабілізацыі ўсіх працаздольных членаў сям'і ў унутры саўгасаў, заключэньня дагавораў з калгасамі на скарыстаньне вольнай рабочай сілы, ушчыльненьня і больш эфэктыўнага скарыстаньня рабочага дню, у сувязі з чым неадвальняюча працякае сенаўборка, праполка і дагляд за гарадамі (саўгасы: Заціцша, Брылёў, Забалоцьце, Жылічы) і асабліва катастрафічным зьяўляецца выкананьне пляну сенаўборкі па найбольш буйным масывам (саўгасы: Капацэвічы, Ліпава, Доўгалесьсе, Уваравічы, Дарашэвічы, Зорка-Захаду, Рудакова і інш.);

в) з прычыны нескарыстаньня ўсіх унутраных рэсурсаў для пакрыцьця не дахопу жалеза і зусім няпоўнай нагрузкі працай майстэрань і кузьняў саўгасаў, сельскагаспадарчыя машыны і інвэнтар адрамантаваны толькі на 54 проц.;

г) да гэтага часу звыш 10 саўгасаў зусім не пераведзены на зьдзельшчыну, а 45 саўгасаў не перавялі на зьдзельшчыну, па жывёлагадоўлі, працэсы кармленьня, уходу і даеньня, ёсьць таксама выпадкі зьніжэньня норм выпрацоўкі (саўгас Плотна).

Падлік эфэктыўнасьці ажыцьцяўленьня зьдзельшчыны ў большасьці саўгасаў яшчэ не наладжан;

д) саўгасы Белсаўгастрэсту пытаньнем сіласаваньня фактычна яшчэ не займаюцца і да гэтага часу няма амаль ніякага ёруху ў справе практычнага выкананьня пляну сіласаваньня (дырэктыва НКЗему БССР аб засіласаваньні ў чэрвені м-цы г. г. 10 проц. ад апублікаванага пляну сіласаваньня ня выканана);

е) Белсельгасснабам ня ўжыты захады да сваечасовага завозу ў саўгасы Белсаўгастрэсту сельскагаспадарчых машын, у выніку чаго, па становішчу на 20 чэрвеня г. г., не завезена: снопавязалак—46, сенакасілак—14, грабель—53, сіласарэзак—35, бульбакапалак 18, трактароў—25 і трактарных цялежак—30;

ж) Бабруйскі дрэваапрацоўваючы камбінат, які павінен быў паводле пляну адгрузіць саўгасам да 15 чэрвеня г. г. 57 сіласных веж фактычна адгрузіў толькі 15. Кіраўніцтва камбінатам і Лесбел ня ўжылі захадаў да сваечасовага ажыцьцяўленьня пляну вытворчасьці сіласных веж. Выходзячы з гэтага, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Белсаўгастрэсту, пад адказнасьць тав. Грэбенчыка і саўгасам, пад адказнасьць іх кіраўнікоў:

а) на працягу дэкады забясьпечыць уцягненьне ў працу ўсіх працаздольных членаў сямей сталых рабочых і служачых саўгасаў.

У гэты-ж тэрмін скончыць заключэньне дагавораў з калгасамі на аказаньне ўзаемнай дапамогі рабочай сілай і сродкамі вытворчасьці па ўборцы ўраджаю і ў першую чаргу па сенаўборцы;

б) неадкладна перавесьці поўнасьцю ўсе асноўныя віды работ у саўгасах на зьдзельшчыну.

2. Даручыць Белсаўгастрэсту прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў тых саўгасаў, у якіх зьдзельшчына ажыцьцяўляецца фармальна і безпадстаўна зьніжаюцца нормы выпрацоўкі.

3. Даручыць Белсаўгастрэсту і Народнаму Камісарыяту Асьветы на працягу 3-х дзён распрацаваць канкрэтны каляндарны плян скарыстаньня вучняў ніжэйшых і вышэйшых школ на работах у саўгасах па ўборцы, там дзе гэта магчыма.

4. Прапанаваць Белсаўгастрэсту і кіраўніком саўгасаў, на працягу дэкады забясьпечыць укамплектаваньне саўгасаў рабочай сілай на час уборкі, а наркампрацы аказаць практычнае садзейнічаньне ў гэтым.

Паказаць усім раённым выканаўчым камітэтам, што на іх таксама ўскладаецца адказнасьць за ўкамплектаваньне саўгасаў рабочай сілай, асабліва па сенаўборцы.

5. Устанавіць, што 10 ліпеня зьяўляецца канчатковым тэрмінам скончэньня рамонту сельскагаспадарчых машын і інвэнтару па адстаючым саўгасам.

Прапанаваць Белсаўгастрэсту прыцягваць да адказнасьці кіраўнікоў тых саўгасаў, якія зрываюць рамонт сельскагаспадарчых машын і інвэнтару.

6. Даручыць Белсельгасснабу, пад адказнасьць тав. Будніка на працягу 5 дзён высьвятліць канчатковы кантынэнт машын, якія будуць завезены саўгасам Белсаўгастрэсту, ужыўшы захады да найхутчэйшага завозу сенакасілак, снопавязалак, грабель, бульбакапалак, трактароў і трактарных цялежак.

7. Паказаць дырэктару Белмэталёб'яднаньня тав. Сакаленка і дырэктару Лесбела тав. Міленькаму на невыкананьне імі пастановы Камісіі Выкананьня за 10 чэрвеня б. г. «Пра выкананьне дырэктыў аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі 1931 г.» (газ. «Савецкая Беларусь» № 136 за 16-VI-1931 г.) аб сваечасовым выпуску і адгрузцы сіласарэзак і сіласных веж і абавязаць іх на працягу дэкады цалкам выканаць плян адгрузкі сіласарэзак і сіласных веж саўгасам Белсаўгастрэсту.

8. Паказаць дырэктару Белсаўгастрэсту тав. Грэбенчыку на няўжыцьцё рашучых захадаў для забясьпечаньня лепшай арганізацыі сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня ў саўгасах і абавязаць яго і дырэктароў саўгасаў зараз-жа прыступіць да сіласаваньня, узмацніўшы тэмпы рамонту старых сіласных установак, а само будаўніцтва сіласных установак павесьці такімі тэмпамі, каб усе сіласныя ямы і траншэі былі пабудаваны да 10 ліпеня б. г., а сіласныя вежы не пазьней як праз 2 дэкады пасьля атрыманьня іх саўгасамі.

9. Абавязаць Белсельбуд, пад адказнасьць дырэктара тав. Слёйкіна заразжа прыступіць да будаўніцтва сіласных веж у тых саўгасах, дзе Белсельбуд вытварае будаўніцтва з тым, каб да 25 ліпеня г. г. устанавіць усе сіласныя вежы.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **Я. Элькін.**

29 чэрвеня 1931 г. г. Менск.

Ударна скончыць месячнік лесазагатовак і вывазкі

Апошнія дні месячніка

ператварыць у штурмавыя дні ў лесазагатоўках і лесавывазках

Без драўніны сацыялістычнае будаўніцтва весьці нельга. Нам патрэбны лесаматар'ялы для пабудовы фабрык, заводаў, гарадзкіх і вясковых пабудоў, для транспарту, нафтавай, вапалкавай і папяровай прамысловасьці.

Нам патрэбны таксама і дровы для апаленьня нашых фабрык, заводаў, гарадоў і вясковых пасяленьняў. Такім чынам, інтарэсы сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны высоўваюць на адно з першых месц праблему лесной гаспадаркі і дрэваапрацоўчай прамысловасьці. Па-гэтаму партыя і ўрад глядзяць на лясную гаспадарку, як на адзін з важнейшых вучасткаў нашага народна-гаспадарчага пляну.

Між іншым, лічбы якія маюцца ў нашым распараджэньні аб загатоўцы і вывазцы лесу яскрава сьведчуць, аб патражаючым прарыве на лесазагатоўчым фронце.

Напрыклад, гадавы плян па загатоўцы дзелавой драўніны ў БССР на 1-е ліпеня г. г. выканаць толькі на 72,5 проц., што датычыцца работы апошняй дэкады, дык тут мы маем яшчэ горшае становішча. Праграма за апошнюю дэкаду чэрвеня месяца па дзелавой драўніне па БССР выканана ўсяго на 68,8 проц.

Праўда, ёсьць Леспрамгасы, якія добра, па бальшавіцку, выконваюць свае заданьні па лесазагатоўках. Напрыклад, Аршанскі леспрамгас па загатоўцы дзелавой драўніны свае гадавое заданьне выканаў на 117,1 пр., і заданьне за апошнюю дэкаду чэрвеня на 225,6 проц., Асіповіцкі—гадавое заданьне выканаў—101,2 проц. і за апошнюю дэкаду чэрвеня 137,1 проц., Бешанковіцкі гадавое заданьне выканаў—115,3 проц., і апошнюю дэкаду чэрвеня 152,6 проц., Віцебскі гадавое заданьне выканаў—114,4 проц. і апошняй дэкады чэрвеня—146,9 проц., Магілеўскі плян гадавога заданьня выканаў на 112,6 проц. і за апошнюю дэкаду чэрвеня—153,7 проц.

Але, побач з гэтым па цэламу ряду Леспрамгасаў БССР мы маем значныя прарывы ў выкананьні лесазагатоўчых пляну, якія паступова скатваюцца па ўніз. Напрыклад, калі Бабруйскі Леспрамгас сваю гадавую праграму па дзелавой драўніне на 1-е ліпеня выканаў на 62,6 проц., дык у той час за апошнюю дэкаду чэрвеня месяца ён значна скаціўся ўніз даўшы выканаўне свайго заданьня толькі на—32,4 проц. тое-ж самае атрымалася і з іншымі Леспрамгасамі: Барысаўскі гадавое заданьне па загатоўкі дзелавой драўніны выканаў на 60,6 проц. і праграму апошняй дэкады чэрвеня на 30,5 проц., Борквавіцкі гадавое заданьне выканаў на 53,7 проц. і ў апошнюю дэкаду чэрвеня на 51,5 проц., Быхаўскі гадавое заданьне выканаў 53,1 проц. і за апошнюю дэкаду чэрвеня 44,1 пр., Бярэзінскі гадавое—45 проц. і за апошнюю дэкаду чэрвеня 25,9 проц., Глускі гадавое—46,7 проц. і 24,4 проц. апошняй дэкады чэрвеня.

Калі мы гаворым аб значных прарывах па загатоўцы дзелавой драўніны, нельга ня спыніцца на загатоўцы і дроў. На гэтым вучастку мы маем яшчэ больш ганебныя прарывы. Гадавы плян па дровазагатоўках у БССР на 1-е ліпеня выкананы толькі на 24,9 проц., а заданьне апошняй дэкады чэрвеня дало яшчэ большае зьніжэньне, (16,4 проц.), ня гаворачы ўжо аб тым, што амаль усімі Леспрамгасамі сыстэматычна плян па дровазагатоўках не выконваецца, ёсьць такія леспрамгасы, якія даюць зусім нязначнае выкананьне пляну. Напрыклад, Бабруйскі Леспрамгас плян дровазагатовак за апошнюю дэкаду чэрвеня месяца выканаў на 4,4 проц., Барысаўскі на 4,3%, Борквавіцкі на 3,5 проц., Бярэзінскі на 2,2 проц., Глускі на 6 проц., Полацкі на 6,2 проц., Рэчыцкі на 7,7 проц. і Хойніцкі на 3,9 проц.

Кажучы аб значных прарывах у лесе і дровазагатоўках нельга абыйсьці маўчаньнем пытаньні і лесавывазкі. Тут мы маем таксама вялікі прарыў. Так, гадавы плян па вывазцы дзелавой драўніны ў БССР на 1 ліпеня выканаў усяго на 38,6 проц., што датычыцца апошняй дэкады чэрвеня дык тут плян лесавывазкі выкананы толькі на 11,7%.

Як бачна абвешчаны савецкім урадам БССР ударны месячнік лесазагатовак і лесавывазкі належнага пералому ў рабоце лесазагатоўчых арганізацый не даў, бо замест падвышэньня прадукцыйнасьці працы, мы маем з кожным днём зьніжэньне.

На прычынах такіх ганебных прарываў варта спыніцца, бо становяць сабою яскравы прыклад, таго, да чаго прыводзіць апартуністычная практыка ў адносінах да кулака, зусім слабае апэрацыйнае кіраўніцтва на такім адказнейшым вучастку, як лесазагатоўкі.

Ня гледзячы на выразныя дырэктывы партыі мы амем факты, калі цьвёрдыя заданьні не даведзены да кулацка заможных гаспадарак. Упаўнаважаныя Леспрамгасаў, РВК і сельсаветаў непраяўляюць належнай рашучасьці ў адносінах націску на кулака нават і там, дзе ўжо і даведзены цьвёрдыя заданьні. Калі гэты націск і праводзіцца, дык з вялікім спазьненьнем без усякага жорсткага кантролю (Лусьнікаўскі і Бешанковіцкі сельсаветы).

Такое становішча надалей бязумоўна ня можа быць цярпімым, бо пры такіх «тэмпах» мы можам апынуцца перад пагрозай зрыву пляну лесазагатовак. Павінны быць ужыты самыя рашучыя захады да ліквідацыі прарываў. А прарывы магчыма ліквідаваць толькі пры тых умовах, калі апэрацыйнае кіраўніцтва з боку Лесбела, Леспрамгасаў і іх вучастковых працаўнікоў будзе забясьпечана непасрэдна на лясных дзелянках.

Да канца месячніку засталося толькі 9 дзён. Гэтыя апошнія дні трэба абавясьціць штурмавымі днямі па выкананьні пляну ударнага месячніку, па ліквідацыі тых прарываў, якія мы маем на лесазагатоўчым фронце. Гэтыя 9 дзён павінны быць сапраўды днямі бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце ўсіх партыйных, гаспадарчых, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый зьнізу і да самага верху.

Бальшавіцкія тэмпы будуць забясьпечаны толькі тады, калі на лесазагатоўках будзе праводзіцца правільная, і жорсткая лінія ў адносінах да кулацка-заможных гаспадарак, даючы ім цьвёрдае заданьне, сыстэматычна кантралюючы выкананьне гэтых заданьняў, гэта па першае.

Па другое трэба шырока прымяніць брыгадны мэтад работы ў лесе—на дзелянках, шырэй разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі, вёскамі, лесарубамі з тым каб праца на дзелянках сярод лесарубаў і возчыкаў стала справай гонару, справай славы, адвагі і гэройства. Толькі пры такіх умовах плян лесазагатовак і лесавывазкі 3-га рашаючага году будзе выкананы поўнасьцю і ў тэрмін.

Маркаў.

За 1 мільён тон сілосу

Зламаць апартуністычнае супраціўленьне сілосу

У Ляднянскім, Клічаўскім, Мазырскім, Сьмілавіцкім, Крычаўскім раёнах да сіласаваньня кармоў не прыступілі, сілосныя ўстаноўкі ня будуюцца

Рашуча ўдарыць па недаацэнцы сілоснай кампаніі. Неадкладна пачаць сіласаваньне кармоў

Сіласаваньне кармоў на ўдарныя тэмпы

Барацьба за 1 млн. тон сілосу ва ўмовах Савецкай Беларусі зьяўляецца зусім закономернай і неабходнай. Выкананьне гэтага пляну падводзіць пры валую кармавую базу пад сацыялістычную жывёлагадоўлю. Аднак, на мясцох мы сустракаемся з правямі поўнага ігнараваньня мерапрыемстваў па сіласаваньні кармоў.

Чэрвеньскі плян сіласаваньня сарваны, будаўніцтва сілосных ям і траншэй выканана на 0,6 проц., сіласаваньне кармоў на 1 проц.

Ня гледзячы на тое, што спачатку чэрвеня трэба было прыступіць да сіласаваньня кармоў, рад калгасаў нават ня думаюць пачынаць будаўніцтва ям і траншэй.

У калгасе «Зьвязда», Мазырскага раёну, цэлы год ляжаць клёпкі для сілоснай вежы, але ніхто ня думае аб тым, каб пабудаваць яе. У Полацкім раёне, за нязначным выключэньнем да сіласаваньня кармоў не прыступаюць, у Клічаўскім раёне плошча пад сілосныя культуры значна скарочана, сілосныя ямы ня будуюцца. Такое-ж стаіць вішча мы маем па Сьмілавіцкім, Ляднянскім і інш. раёнах.

Вузкім месцам у правядзеньні сілоснай кампаніі зьяўляецца падрыхтоўка кадраў. У радзе раёнаў зрываюцца курсы па падрыхтоўцы інструктароў для правядзеньня сіласаваньня кармоў. Копыльскі, Грэскі і рад іншых раёнаў зусім нічога не паведамляюць як праходзяць у іх курсы, у Крычаўскім раёне курсы сарваліся. На пытаньне падрыхтоўкі кадраў для правядзеньня сіласаваньня кармоў трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу.

Ня гледзячы на неаднаразовыя сыгналы нашага друку аб тым, што прамы словасьць тармозіць выпуск сілосных вежаў, да апошняга часу ў гэтай галіне няма яшчэ належнага пералому. Завод «Дрэваапрацоўшчык» на 5-га ліпеня адгрузіў 51 вежу, што складае 51 проц., Бабруйскі камбінат на 3-е ліпеня адгрузіў 63 вежы ці 21 проц. пляну.

Гэтыя тэмпы не даюць ніякай упэўненасьці ў тым, што да 1-га жніўня сілосныя вежы будуць пабудаваны. Трэба рубам паставіць пытаньне перад нашай прамысловасьцю, каб будаўніцтва сілосных веж паставіць на ўдарныя тэмпы. Неабходна забясьпечыць сваячасовую ўстаноўку вежаў і запаўненьне іх сілоснай масай.

Правядзеньне сілоснай кампаніі патрабуе мабілізацыі шырокай думкі грамадзкасьці. Трэба рашуча змагацца з усякімі праявамі надбайнасьці і права га апартуністу ў справе правядзеньня сілоснай кампаніі.

Плян сіласаваньня ў 1 мільён тон часу трэба выканаць чаго-б гэта ні каштавала.

Забясьпечыць сваячасовае выкананьне пляну сіласаваньня

Сіласаваньне кармоў праводзіць плянава. Правільная арганізацыя працы ў калгасах і саўгасах—асноўная ўмова выкананьня пляну сіласаваньня. Зараз ўся працоўная сіла саўгасаў і калгасаў павінна пераключыцца на ўборку сена і сіласаваньне кармоў.

Па сіласаваньні арганізуюцца такія брыгады: 1) па будаўніцтве новых сілосных установак, абсталяваньні і правядзеньні ў парадак усіх старых установак; 2) па ўборцы сілосных культур і розных траў, правядзеньні сіласаваньня і далейшым даглядзе за сілосным устаноўкамі.

Брыгады працуюць па пляну, складзенаму і зацьверджанаму праўленьнем калгасу ці дырэкцыяй саўгасу; плян павінен быць календарным. Па кожнай брыгадзе вызначаецца брыгадзір, які адказвае за выкананьне пляну працы сваёй брыгады.

Усе работы ў час сілоснай кампаніі абавязкова павінны быць пераведзены на зьдзельшчыну.

Якія культуры сіласуюцца. Павінны быць засіласаваны цалкам: уся кукуруза, увесь сланечнік, высеяны як сілосныя культура; увесь бульбянік і націньне кораньплодаў; увесь пажнівны турнэпс; асокі і іх атава; пустазельле, чарот, аер; пашкоджаныя хваробай, а таксама падмерзшая бульба, кораньплоды. Могуць і павінны быць засіласаваны, калі ня пойдуць на летні зялёны корм, падсяўная сэрадэла, пажнівная віка-аўсяная мешанка, атава ўсіх пасеўных траў і сенажатнае сена, калі час іх уборкі супадае з дрэнным надвор'ем і іх нельга належным чынам высушыць, у выніку чаго можна атрымаць дрэннае сена.

Сачэце за якасьцю будаўніцтва сілосных установак. Будаўніцтва новых установак і рамонт старых павінны быць закончаны ў асноўным у бліжэйшыя дні. Рамонт старых сілосных установак будзе наступны: рассохшыя сьценкі дошкавых вежаў трэба сьцягнуць абручамі, каб на было шчылін; сьцены мураваных вежаў трэба адрамантаваць (замазаць расколіны, выбоіны і г. д.). Сьцены плеценых ям і траншэй атынкаваць. Сьцены ям і траншэй трэба выраўняць і абніцаваць глінай. Агледзець і паправіць дно ўсіх установак. Апроч усяго, сьцены ўсіх старых установак трэба пабяліць растворам вапны для зьнішчэньня цьвілі, грыбкоў і інш. Вакол ям і траншэй, пабудаваных у грунце, павінны быць зроблены ручаўкі для адводу вады.

Каляндарны плян сіласаваньня. Каляндарны плян сіласаваньня складаецца загадзя па форме: 1) назва культуры для сіласаваньня; 2) тэрмін уборкі і сіласаваньня; 3) плошча, з якой будзе зьбірацца сілосны матар'ял; 4) колькасьць зялёнай масы, якая будзе атрымана з паказанай плошчы; 5) від і месца сілоснай пабудовы; 6) тэрмін да якога кожная сілосная ўстаноўка павінна быць прыведзена ў поўны парадак.

Для буйнай рагатай жывёлы сілос трэба рыхтаваць, выходзячы з такога разьліку: на 1 карову на год патрэбна 3 тоны сілосу, на 1 галаву маладняка старэйшага за 1 год—1,2 тоны.

Для БССР лепшы тэрмін сіласаваньня кармоў будзе наступны:

Назва расьлін	Фаза разьвіцьця	Тэрмін сіласаваньня	
		I укос	II укос
1. Асокі і пустазельле	Да і ў час красаваньня	Чэрвень	Верасень
2. Віка-авёс . . .	Пачатак паяўленьня стручкоў	Канец ліпеня пачатак жніўня	—
3. Бульбянік рачьняй бульбы	За тыдзень да копкі бульбы	Ся эдзіна жніўня	—
4. Сланечнік . . .	Палова шашкі закрасавала	Канец жніўня	—
5. Кукуруза . . .	Зярня набліжаецца да поўнай сьпеласьці	Сярэдзіна верасьня	—
6. Канюшына (цімафеўка	—	Канец чэрвеня	Верасень да марозаў
7. Сэрадэла чыстага пасеву	Частка расьлін красуе. На частцы зьяўляецца стручкі	Канец ліпеня, пачатак жніўня	
8. Сэрадэла падсяўная	—	Верасень да марозаў	
9. Бульбянік позьніх сартоў бульбы . . .	За тыдзень да копкі бульбы	Верасень	
10. Пажыўны віка-авёс	—		
11. Націньне кораньплодаў	—	Верасень, пачатак кастрычніка	
12. Пажыўны турнэпс .	—		
13. Бульбіны . . .	—	Кастрычнік	

Да 15-га кастрычніка сіласаваньне павінна быць скончана. Гэтае мерапрыемства забясьпечвае ня толькі выкананьне, але перавыкананьне вызначанага пляну для БССР 1 млн. тон сілосу.

Уся работа па сіласаваньні павінна быць пастаўлена на рэйкі ўдарніцтва і сацспаборніцтва асобных гаспадарак паміж сабой.

Гэта забясьпечыць стварэньне моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Горацкая занальная станцыя малочнай гаспадаркі.

Жывёла будзе забясьпечана кармамі

Вопыт мінулай зімы паказаў, што без стварэньня моцнай кармовай базы нельга пабудаваць буйную жывёлагадоўчую сацыялістычную гаспадарку. Гэта ўлічыла калгасная грамадзкасьць калгасу імя Энгельса, Уваравіцкатараёну, якая загадзя прыступіла да загатоўкі кармоў. Калгас засеяў 18,6 га сіласных культур. З прычыны недахопу насеньня сіласных культур было засеяна 13 га бульбы і 3 га вікі. Плошча зялёнай масы з 34,6 га забясьпечыць сіласным кормам статак калгасу на зімовы пэрыяд.

Плян па сяўбе бульбы значна перавыкананы: замест 208 га засеяна 285 га. Калгас гэтага дабіўся ў выніку ўдарнай працы калгасьнікаў і актыўнай дапамогі студэнтаў-практыкантаў, скрыгалаўскага с.-с. тэхнікуму.

Да 28 чэрвеня калгас скасіў 160 га канюшыны, з якой палова ўбрана і складзена ў пунях і торпах.

Аднак, трэба

Бальшавіцкі агонь па клясавым ворагу

ВУРОКІ ЗАВОДУ „КАМІНТЭРН“ ПАВІННЫ ЎЛІЧЫЦЬ УСЕ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ БССР

Бязьлітасна пакараць Пярчонка, Клімковіча і Прылуцкага, зацкаваўшых ударніцу Маткевіч

У кальцы зьдзекаў і цкаваньня

Антося Маткевіч прышла на Нова-Барысаўскі Лесаапрацоўчы камбінат «Камінтэрн» нядаўна. Сёлета, у красавіку. Яна ня мела пэўнай кваліфікацыі, працавала чорнарабочай. Аднак, праца вітую—яе не здавальняла гэтая работа. Яна хацела параўнацца з кваліфікаванымі рабочымі-мужчынамі.

У красавіку заводакіраўніцтва парашыла вылучыць на работу на фрэзэрным варштаце жанчыну. Але стаць ля фрэзэрнага варштату не адважылася ніводная жанчына на заводзе.

Маткевіч з вялікім захапленьнем уся лася за гэтую справу. Яна сьмела стала за варштат ,за якім ніколі за час існаваньня капыльнай вытворчасьці Барысаўшчыны не стаяла жанчына.

Праз кароткі час з чорнарабочай Маткевіч вырасла ва ўдалую, кваліфікаваную фрэзэроўшчыцу

Крывая выпрацоўкі яе варштату шпарка бегла ў гару. Ужо 25-га краса віка за дзень яна выпрацавала 300 пар капылоў. 31-га ліча вырасла да 360. Гэта—72 проц. нормы.

У чэрвені (у маі фабрыка не працава ла) крывая выпрацоўкі Антосінага варштату яшчэ больш паскорыла свой бегугару. 6-га чэрвеня тав. **Маткевіч** дала 470 пар капылоў. 10-га—519, 14-га—610, 16-га—657, 27-га—717 капылоў. Норма выпрацоўкі на гэты раз была вызначана ў 650 пар.

* * *

Раней, калі капыльная вытворчасьць ня была яшчэ аб'яднана ў камбінат **«Камінтэрн»**, існавала самастойная капыльная фабрыка **«Рабочы»**, дрэнна абсталяваная і зусім немеханізаваная.

На гэтай фабрыцы яшчэ і тады група **«рабочых» Пярчонка, Клімковіч і Прылуцкі** знаходзілі поле для сваёй шкодніцкай дзейнасьці.

Было ні адзін раз заўважана, што Клімковіч крадзе вострыя фрэзэрныя нажы. Прыходзячы на зьмену, рабочыя часта знаходзілі замест вострых нажэй тупыя, часта нажы ў варштатах былі пераблытаны. Гэта рабілася нарачыта з мэтаю сарваць выкананьне прамфінпляну: давесьці, што вызначаныя нормы выпрацоўкі нельга выканаць.

Клімковіч, Пярчонка і Прылуцкі—клясавыя вораг—імкнуліся выжыць, зацерці ўсё новае з фабрыкі, і ў прыватнасьці маладыя кадры фрэзэроўшыкаў. Яны лічылі сябе лепшымі кваліфікаванымі спэцыялістамі фрэзэроўкі, і таму не жадалі дапусьціць, каб на фрэзэрных варштатах працавалі новыя маладыя рабочыя.

У пачатку, аб'ектам для агіднага цкаваньня яны абралі рабочага **Левіна**. Тав. Левін, жадаючы перакваліфікавацца, пачаў за свае сродкі вывучаць работу на фрэзэрным варштаце. Бачачы, што Левін шпарка засвойвае фрэзэрную справу, Пярчонак, а потым і Клімковіч пачалі перашкаджаць яго рабоце. Нарэшце, яны дамагліся ,што ідучая ў іх на паваду адміністрацыя цэху зьняла Левіна з работы на фрэзэрным варштаце і накіравала зноў на некваліфікаваную работу. І толькі тады, калі фабрыка **«Рабочы»** улілася ў камбінат **«Камінтэрн»**, калі патрабаваліся новыя фрэзэроўшчыкі Левін быў зноў пастаўлены на фрэзэрны варштат.

Тут шкоднікі з новай сілай распачынаюць цкаваньне. За лепшым варштатам працуе **Клімковіч**. У другой зьмене на гэтым-жа варштаце—тав. **Левін** і для таго, каб ня даць магчымасьці працаваць тав. Левіну, у час яго работы прыходзіць таксама і Клімковіч, патрабуючы «свой варштат».

Аднойчы, **Клімковіч** абманяў нажы, замест вострых паставіў тупыя, у выніку чаго выпрацоўка Левіна за 6 гадз. 15 хв. раўнялася ўсяго 330 парам капылоў. Калі-ж гэты агідны ўчынак быў ліквідаваны, **Левін за адну гадзіну 45 хв. даў 150 пар.**

Але гэта толькі некаторыя рысы гэй агіднай клясава-варожай справы, якую рабілі **Клімковіч, Пярчонак і Прылуцкі.** Галоўны цяжар жудасьці цкаваньня паранейшаму падаў на галаву ўдарніцы Антосі Маткевіч. Штодня, штогадзіна яна была абкружана зьдзекамі, на кожным кроку ёй ставіліся рагаткі.

Групай—**Пярчонак, Клімковіч і Прылуцкі**—перастаўляюцца нажы, паслабляюцца сьціскі варштату, на якім працуе Маткевіч. Варштат ідзе ў халастую. І ў такі момант ёй пагражала сьмерць ад удару вылятаючай калодкі.

Нарэшце, Маткевіч падкладваюць брак.

І колькі такіх агідных зьдзекаў пры ходзілася ёй царпець штодзённа.

І як нядзіўна, усё гэта адбывалася на вачох адміністрацыі цэху, цэхпрафкамітэту, цэхавай партыйнай ячэйкі. І нібыта нікога гэта і не датычыцца.

Нарэшце 26-га чэрвеня на цэхавым сходзе рабочыя ўзьнімаюць пытаньне аб цкаваньні і зьдзеках **над Маткевіч.** Пярчонак, Клімковіч і Прылуцкі і тут знаходзяць хітрае выйсьце. Яны карыстаюцца тым, што адміністрацыя ізмкнулася зацерці на сходзе сутнасьць справы, абвяшчаюць сябе вытворчай камунай і нават дылёматычна запрашаюць у яе тав. Маткевіч.

27-га чэрвеня—першы дзень яе работы ў камуне. За паўгадзіны Маткевіч дае 53 пары капылоў. Гэта значыць 848 пар капылоў за 8 гадзінны рабочы дзень г. зн.—198 пар звыш вызначанай нормы:

Шкоднікі, нарэшце ня стрымліваюць хвалі абурэньня. Яны спыняюць у час работы Маткевіч і заяўляюць: **«Мы ў камуну цябе ня прымаем».**

Скрынку для гатовай прадукцыі ля варштатаў на якіх работалі Маткевіч і Пярчонак, апошні паставіў так, каб Маткевіч кожны раз адыходзіла ад свайго варштату каля кладкі вырабаў, і гэтым губляла каштоўны працоўны час. Гэтым Пярчонак хацеў дамагчыся зьмяншэньня выпрацоўкі, павялічэньня браку прадукцыі тав Маткевіч.

Маткевіч з плачам выбегае з цэху і толькі праз 20 хвілін, глыбока пакрыўджаную яе зварачваюць ў цэх да варштату.

Цкаваньне Маткевіч у гэты дзень да сягнула сваіх жудасных разьмераў. Таму яна ў гэты-ж дзень падае заяву ў цэхкамітэт аб тым, што далей яна працаваць так ня можа. Старшыня цэхкамітэту **Краснажонаў на гэта заяўляе: «кінь праліваць бабскія сьлёзы»** і заява тав. Маткевіч ня была прынята.

Яна перадала гэтую заяву перад партсходам сакратару партячэйкі тав. Аношка. Той, ня разглядзеўшы справу, толькі 28-га чэрвеня перадаў старшыні цэхкамітэту таму-ж тав. Краснажонаву:

Ня менш «уважлівыя» адносіны суспрэда цкаваная Маткевіч і з боку адміністрацыі, з боку заўкому і парткалектыву.

26-га чэрвеня на сходзе абураныя цкаваньнем лепшай ўдарніцы рабочыя патрабавалі супыненьня гэтае агіднае справы, патрабавалі пакараньня вінавайцаў.

І на гэта загадчык вытворчасьцю **Агафонаў** заявіў **«Я урэгуляваў усе маючыяся непаладкі»..:**

І так пагаманілі... Паспрачаліся... а справа ніколькі не зьмянілася.

А сакратар заўкому **Каваленка?** Ён аказаўся вартым усіх заводзкіх кіраўнікоў, сьляпых, згубіўшых бальшавіцкую пільнасьць, аб'ектыўных дапаможнікаў справе клясавых ворагаў—**Пярчонка, Клімковіча і Прылуцкага. Гэты** Каваленка злачынна трымаў заяву **Маткевіча** ў папках заўкому, замест таго, каб накіраваць ў пракуратуру, як гэта было яму даручана.

А ячэйка камсамолу «Камбінату»? Яна стаяла ў баку ад гэтае справы. І гэта ў той час, калі ў ліку злачынцаў **Прылуцкі—камсамолец...**

І так, зацкаваная, **Антося Маткевіч** засталася адна, бездапаможная. Адна сярод дзікіх зьдзекаў, кпінаў, «сьвяткуючых перамогу» **Пярчонка, Клімковіча і Прылуцкага**—сярод бяздушнасьці кіраўнікоў заводу.

Знаходзячыся ў вельмі абвостраным нэрвовым стане, на мяжы вар'яцтва тав. Маткевіч усё-ж не пакідае сваіх грамадзкіх абавязкаў. Свой выхадны дзень 28-га чэрвеня яна аддае суботніку на прыгараднай фэрме.

Але нэрвы ня вытрымалі. І ўначы з 28-га на 29-е чэрвеня канчаткова падаліся... **Тав. Маткевіч звар'яцела.**

Вось, жудасная гісторыя цкаваньня работніцы-ударніцы, гісторыя агіднай справы клясавага ворага, які імкнецца вырваць з радоў рабочае класы усё лепшае.

Громаў С. («Сав. Беларусь»)
Ракіта С. («Зьвязда).
Клебанаў Р. («Бальшавік Барысаўшчыны»):

Пастанова бюро Барысаўскага РК КП(б)Б па справе цкаваньня работніцы дрэваапрацоўчага камбінату т. Маткевіч

Заслухаўшы паведамленьне камісіі аб выніках праверкі допісу рабкора заводу **«Камінтэрн»** накіраванага ў рэдакцыю газ. **«Бальшавік Барысаўшчыны»**, аб цкаваньні і зьдзеках над работніцай тав. Маткевіч з боку групы рабочых заводу «Камінтэрн» капыльнага цэху—**Пярчонка, Клімковіча і Прылуцкага,** Бюро РК КП(б)Б лічыць факты цкаваньня і зьдзекаў цалкам устаноўленымі.

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і яе Ленінскага ЦК, у рашучай барацьбе з апартунізмам на два франты, у бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам, перамагаючы нашы часовыя труднасьці, дасягнула вялізарнейшых посьпехаў у справе індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і на аснове суцэльнай калектывізацыі пасьпяхова ліквідуе кулацтва, як клясу.

Клясавы вораг у сваім шалёным супраціўленьні скарыстоўвае ўсякія сродкі ў барацьбе з пасьпяховым выкананьнем задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Цкаваньні і зьдзекі ў капыльным цэху заводу **«Камінтэрн»** над работніцай-ударніцай тав. **Маткевіч** з боку рабочых заводу—**Пярчонка, Прылуцкага і Клімковіча,** якія праводзілі падмен нажэй, аслабаненьне сьціскаў да варштату, блытаньне буксаў, закрыцьцё вэнтылятараў, падкладваньне да варштату браку, штодзённыя зьдзекі над ёй, як над ударніцай і г. д.—зьяўляюцца вынікам клясавага ворага, накіраванай на зрыў выкананьня прамфінпляну, на зрыў разгортваньня сацыспаборніцтва, ударніцтва і ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі па прыцягненьні жанчын-работніц на кваліфікаваную адказную і кіруючую работу на вытворчасьці.

Гэтай вылазцы клясавага ворага спрыяла недацэнка з боку бюро парткалектыву заводу, бюро цэхячэйкі, а таксама профарганізацый, палітычна-выхаваўчай работы сярод рабочых заводу і асабліва сярод жанчын, уцягненьня іх у вытворчасьць і падвышэньня іх кваліфікацыі, аб чым яскрава сьведчыць адсутнасьць жанчын, працуючых на фрэзэрных варштатах.

Канстатаваць, што бюро парткалектыву рэагавала на гэтую вылазку клясавага ворага з вялікім спазьненьнем, а цэхячэйка, камсамольскі калектыў і прафсаюзныя арганізацыі заводу зусім не рэагавалі, праявіўшы палітычную блізарукасьць, ня ўзьняліі гэты факт на належную палітычную вышыню і не мабілізавалі рабочай масы вакол гэтай справы.

Адміністрацыяй заводу і ў прыватнасьці загадчыкам цэху тав. Бакуном праўлены нядбайныя, злачынныя адносіны да справы складаньня належных умоў для работы тав. Маткевіч і ў справе рэагаваньня на зьдзекі і шкодніцтва з боку гэтай групы рабочых.

Выходзячы з гэтага, бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

За несваячасовае рэагаваньне і мабілізацыю палітычнай думкі рабочых заводу вакол гэтай справы, а таксама несваячасовае паведамленьне бюро РК КП(б)Б абвясьціць вымову бюро парткалектыву заводу.

Справу аб тав. Ароніне (б. сакратара парткалектыву) і Краснажонаве, які некалькі дзён трымаў заяву, пададзеную работніцай Маткевіч, не рэагуючы і не паведамляючы аб гэтым бюро парткалектыву—перадаць у райКК для прыцягненьня іх да партыйнай адказнасьці.

Пастанову бюро парткалектыву аб вынесеныя вымовы фракцыі заўкому, а таксама вынесеныя вымовы бюро цэхячэйкі, фракцыі цэхпрафкому і аб роспуску іх за нерэагаваньне і палітычную блізарукасьць—зацьвердзіць.

За несваячасовае рэагаваньне і нескладаньне адпаведных умоў для работы т. Маткевіч—загадчыка капыльнага цэху тав. Бакуна зьняць з кіруючай работы і справу перадаць РайКК.

Прапанаваць бюро РК КСМ у тэрміновым парадку праверыць работу камсамольскага калектыву заводу, з мэтаю прыцягненьня да адказнасьці бюро камсамольскага калектыву за бязьдзейнасьць і несваячасовае рэагаваньне. Пры праверцы забясьпечыць мабілізацыю ўсёй камсамольскай арганізацыі на справу выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Прапанаваць фракцыі райпрофсавету ў самым тэрміновым парадку праверыць становішча работы фабкому, мабілізаваўшы ўсіх рабочых вакол праверкі і на ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінпляну з тым, каб у другое паўгодзьдзе трэцяга рашаючага году пяцігодкі забясьпечыць перавыкананьне прамфінпляну.

Прапанаваць райпракурору тав. **Фіглоўскаму** на працягу 2-х дзён скончыць сьледзтва па гэтай справе і справу разгледзіць у паказальным парадку.

Надаючы вялікае палітычнае значэньне гэтай справе, бюро РК прапануе ўсім партыйным калектывам, партячэйкам, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыям разгарнуць вакол яе шырокую палітычна-масавую работу, шляхам абгаварэньня на сваіх пасяджэньнях і на агульных сходах рабочых пастановы бюро РК па справе аб цкаваньні работніцы Маткевіч і яшчэ больш мабілізаваць усю партыйную, камсамольскую і рабочую масу на барацьбу з клясавым ворагам і яго агентурай правымі і «левымі» апартуністамі, на ажыцьцяўленьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінпляну, забясьпечыўшы перавыкананьне яго ў другой палове трэцяга рашаючага, на абладаньне тэхнікай, на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай і асенняй пасеўнай кампаніі, на ўздым калгаснага руху і ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі па ўкараненьні жаночай працы на прадпрыемствах, узмацненьне палітвыхаваўчай работы сярод жанчын, аўладаньне імі тэхнікай і высоўваньне жанчын-работніц і калгасьніц на адказную кваліфікаваную работу.

Барысаў. 4-VII—1931 г.

ШАХМАТЫ І ШАШКІ

№ 8 (223)

Пад рэдакцыяй А. А. Касьперскага

Эцюды № 3 і 4 Я. Х. Гордзіна (Бабруйск)

З кнігі аўтара „Курс кацоў партый“.

Чорныя



Белыя: дамкі a3, b4, h8.
Чорныя: дамка h4, п f4.

Белыя



Белыя: дамкі c3, d2, g1.
Чорныя: дамка c7, п g3.

Белыя пачынаюць і выйграюць.

Шахматна-шашачныя спаборніцтвы БССР 1931 г.

У сувязі з пераменай форм спаборніцтваў СССР у 1931 г. па БССР праводзяцца па шахматах і шашках групавыя, а іменна:

1. Чампіянаты Менску.
2. Раённыя турніры, якія адбудуцца ў Віцебску і Гомелі.

Спаборніцтвы ў Віцебску пачнуцца 21 ліпеня г. г.

Удзел павінны прыняць па шашках: 4 прадстаўнікі ад Віцебску, 2—ад Полацку і па аднаму а Воршы і Барысаву. Па шашках: ад Віцебску 4 прадстаўнікі, Полацку—1, Воршы—2 і Барысаву—1.

Спаборніцтвы ў Гомелі пачнуцца 22 ліпеня г. г. Па шахматах: 4 ад Гомелю, 2 ад Магілеву і па аднаму ад Бабруйску і Мазыру.

Па шашках: Гомелю—4, Бабруйску—2 і па аднаму Магілеву і Мазыру.

Наогул удзел павінны прыняць лепшыя ігракі названых гарадоў.

Пераможцы турніру прымуць удзел у чампіянатах СССР.

Усесаюзны зьезд і спаборніцтвы адбудуцца ў Маскве, пачатак 5 кастрычніка г. г.

Шахм.-шашачн. курсы інструктараў (Менск)

Пачатак заняткаў на курсах 15 ліпеня, а 7 г дз. увеч., у памяшканьні ВСФК Бел., рог Ленінскай і Карла Маркса, 2-гі дом саветаў, першы паверх.

фабрычна-заводзкія спартакіяды

У красавіку—чэрвені адбыліся шахматна-шашачныя спаборніцтвы па прадпрыемствах. Трэба адзначыць, што ў некаторых гуртках спаборніцтвы былі спушчаны да цэхаў, вынікі наступныя: на саюзу скурнікаў.

1) скур-галянтарэйная фабрыка „Усход“ шашкі пры 55 ігр. 1) Кейдес, 2) Альбух, 3) Мішэлевіч.

2) Абутковая майстэрня,—Іграла 23 ігр., па шашкам 1) Хадасевіч Ая. 2) Мацыяс; па шахматам 1) Сьлепнаў, 2) Вашкевіч.

3) Абутковая ўцільком, па шашкам іграла 34 ігр. на першым мейсцы т. Шнэйдар.

4) Абутковая майстэрня пры ДПУ, на шашкам лепшыя вынікі, 1) Гардон і 2) Альтман.

Па саюзу харчавікоў па шашкам.

1) Клюб 20 Ігракоў, пераможцы Калтуноў, Бельнік.

5) Хлебазавод—72 ігр., пераможцы—Шварц, Батаеў, Дрэйзін, Эйціцкі, Палтэр, Кац і Усьціноў.

3) Аддзяленьне хлебазаводу 24 ігр.—пераможцы—Гелемсон, Шымановіч, Радзюк, Рэўш і Мельцэр.

4) Завод „Беларусь“ 25 ігракоў, пераможцы—Сталкоўскі, Славінскі і Мадылевіч.

5) Скатабойня. 30 Ігракоў, пераможцы—Кац і Капонік.

Пабудаваць лёнаапрацоўчы пункт

Лёнасалому, якую калгасы Клічаўшчыны ня ўправіліся адасласць увосень, была зімой разаслана райкаапсаюзам на пункт. Валакно атрымалася з лёну зімовага адсьцілу добрае. Частку гэтага лёну зьмялі, а значная частка, (тоны 4 з лішкам) ляжыць ня мятым і цяпер. Другая частка лёну ляжыць на полі ў кучах і бязмоўна, псуецца.

Сёлета калгасы Клічаўшчыны пасеялі 575 га лёну і 85 га канапель. Некаторыя калгасы напэўна ня змогуць апрацаваць лён сваімі сіламі.

Вось, тут райкаапсаюзу як асноўнаму загатоўцы лёнапрадуктаў па калгасах і неабходна над гэтым пытаньнем падумаць. Пытаньне апрацоўкі лёну у свой час было паднята ў раёне, але потым яно заглохла.

Факты гавораць за тое, што калгасы ўсёй лёнапрадукцыі самі не апрацуюць Трэба пабудаваць хоць прымітыўны лёнаапрацовачны пункт пры Райкаапсаюзе, бо калгасы ўжо кажуць:

— Плян засеву лёну выканаем, а рабочай сілы ў нас малавата, лёну апрацаваць мы ня ўправімся.

Падрыхтоўкі да зборкі пакуль, што яшчэ нідзе не адчуваецца. Трэба хутчэй пачаць сваячасовую падрыхтоўку да ўтварэньня прымітыўнага лёнаапрацоўчага пункту.

Мікіта.

Да закладкі сілосу не прыступілі

Калгас **«Чырвоны Прафінтэрн», Сьмілавіцкага раёну, не прыступіў яшчэ** да закладк сілосу. Праўленьне калгасу ня цікавіцца гэтым пытаньнем і не паставіла яго на абгаварэньне агульнага сходу.

Калгасу **«Чырвоны Прафінтэрн»** неабходна зараз-жа прыступіць да сілаваньня кармоў.

Калючы.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр
СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава
Чыо-Чыо-Сан музыка Пучыні
Пачатак а 8 гадзіне
Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк
СЁНЬНЯ І ШТОДЗЁННА
1-я гастроль яўрэйскага атракцыёну ілюзіяністаў
МАРЧЭС з яго трупай ліліпутаў
2. ДОНВАЛЬДА—Татарская трупа
3. ЭРНАНІ—Музычныя эксцэнтрыкі
4. АЎТАМАТ-ЛЯЛЬКА—Фроэ
5. ЖАКЕЙ АЛЕКСАНДР
Пачат. а 8 г. 45 х. увечары
Льготныя білеты ў рабкасе
АНОНС: прадстаўленьне 12 ліпеня.

„Чырвоная Зорка“
Новы савецкі фільм ПЕРШЫ РЭЙС Звыш праграмы кам. у 1 ч. ПАЛЕШКА
Новы гукавы часопіс Саюзкіно-хроніка.
Пачатак а 7, 8-45 і 10-30. Каса з 5 г.

Кіно-тэатр „Культура“
Новы савецкі фільм АРАТЫЯ МОРА
Звыш праграмы Саюзкіно-хроніка № 28.
Пачатак а 7 гадзіне.

Кіно „Інтэрнацыянал“
Ната Вачнадзэ ў карціне ГЮЛІ
Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно
Пачатак 4 сэаноў а 7 гадз.

Кіно „Пралетары“
Мастацкі фільм па аповесьці А. С. Пушкіна
КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА
Пачатак а 2, 3-45, вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

Менскі Фінансава-Эканамічны Тэхнікум
пры НКФ БССР
АБВЯШЧАЕ НОВЫ ПРЫЁМ
НА ПЕРШЫ КУРС ТЭХНІКУМУ
з 1 чэрвеня па 1 жніўня.
Тэхнікум мае 4 аддзяленьні:
1. Фінансавае. 2. Банкаўскае. 3. Ашчаднае. 4. Ракунковае.
Мэта тэхнікуму:
Падрыхтоўка эканомістых-фінансаў, сярэдняй кваліфікацыі. Для фінансавай банкаўскай і крэдытнай сыстэмы. Прымаюцца асобы не маладзей 16 год, з асьветай ня ніжэй курсу сямігодкі.
Да заявы прыкладаюцца:
а) зацьверджаная анкета па форме, устаноўленай для паступаючых у тэхнікум; б) дакумант аб асьвеце; в) дакумант аб сацыяльным становішчы і паходжаньні. Сяляне прадстаўляюць даведку ад с-савету аб аплаце с.-г. падатку; г) выпіска аб нараджэньні; д) мэдычная даведка аб стане здароўя.
Скончыўшыя сямігодкі да 1929 г. падлягаюць іспытам па наступным прадметам: грамадазнаўстве, матэматыцы і беларускай мове.
З агульнага ліку прынятых—55 проц. будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу: Менск, Савецкая № 59, (другі паверх) Фінансава-Эканомічны Тэхнікум.
У бягучым навучальным годзе будзе прынята 130 асоб. Заняткі пачнуцца 1 верасьня.
Тэрмін навучаньня—3 гады.
1—2 Дырэктар тэхнікуму А. Казакоў.

ВСНГ БССР АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ СЛУХАЧОЎ-ЗАВОЧНІКАЎ У ГОМЕЛЬСКІ ЗАВОЧНЫ МЭХАНІКА-МАШЫНАБУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ
на аддзяленьне халоднай апрацоўкі мэталяў.
Правілы прыёму можна атрымаць у палітэхнікуме—Менск, палітэхнікуме—Віцебск, мэханічным інстытуце—Гомель і ва ўсіх гар. і райпрафсаветах.
Прыём заяў праводзіцца з 5 ліпеня г. г. непасрэдна інстытутам па адрасе: г. Гомель, Мэханіка-машынабудаўнічы інстытут.
2—2 Сэктар кадраў ВСНГ БССР.

БЕЛІЦКІ ТЭХНІКУМ
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР НА АДДЗЯЛЕНЬНІ:
1. Зоатэхнічнае, 2. Малочна-тэхналёгічнае.
Тэхнікум знаходзіцца ў 5 клм. ад чыгункі ў буйным саўгасе. Пры тэхнікуме знаходзяцца: узорны скотны двор, малочны завод, габінэты, лябараторыі. Працяг навучаньня—3 гады.
Заявы падаюцца па адрасе: ст. Бурбін, Ворша-Лепельскай чыг., п-а Беліца, Беліцкаму тэхнікуму. Заявы прымаюцца да 5-IX
Да заявы прыкладаюцца дакументы згодна даведніка НКА за 1930-31 г. Асобы, якія ня маюць адукацыі за 7-годку, але падалі заявы, павінны зьявіцца 5—12-IX на іспыты ў тэхнікум.
Інтэрнатамі і стыпэндыяй забясьпечваюцца студэнты ў першую чаргу беднякі-калгасьнікі, батракі і рабочыя.
Заняткі пачнуцца 15-IX, аб чым залічаным будзе паведамлена своячасова.
Дырэктар тэхнікуму ЭРДМАН.

МАГІЛЕЎСКІ МЭДПАЛІТЭХНІКУМ АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
на фармацэўтычнае і акушэрскае аддзяленьні.
Прыём разьлічан на 200 асоб.
Прымаюцца бяз іспытаў скончыўшыя 7-годкі, альбо раўналежныя па праграмах школы.
Заявы прымаюцца з 1 ліпеня па 1 верасьня 1931 г.
Да заяў павінны быць прыкладзены наступныя дакументы:
1) Арыгінал пасьведчаньня аб адукацыі, 2) [illegible] аб сац.-м[illegible] ным становішчы бацькоў (для сялян с.-г. падатку за 1930-31 год), 3) [illegible] ведку аб выбарчых правах паступаючага і яго бацькоў, [illegible] альбо спраўку аб нараджэньні, 5) спраўку аб стане здароўя, 6) засьведчаную анкету, 7) Засьведчаныя 2 фатаграф. карткі (6) 30 [illegible] рак для адказу.
50 проц. студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Заняткі пачнуцца 1 кастрычніка 1931 г.
Адрас: г. Магілеў. мэдпалітэхнікум.
1—3 Дырэктар [illegible]

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ГЛУХАНЯМЫХ
(у г. Мсьціслаўлі) абвяшчае, што
ПРЫЕМ ДЗЯЦЕЙ
у гэтым годзе адбудзецца 26-27 жніўня
і пасьля гэтага тэрміну ніякіх прыёмаў на будзе.
Прымацца будуць дзеці нараджэньня 1923, 1924 і 1925 гадоў у ліку 12 чалавек. Іншыя ўзросты ня прымаюцца. Дакументы патрэбны для прыёму: наступныя: 1) вэтрыка аб часе нараджэньня; 2) аб сацыяльным становішчы; 3) даведка ўрача аб стане здароўя.
Дакументы трэба прыслаць да 25 жніўня.
Прымаюцца дзеці толькі пасьля праверкі камісіяй пры інстытуце, завочна па дакумэнтах ня прымаюцца. У першую чаргу прымаюцца дзеці дзіцячых дамоў, дзеці рабочых, калгасьнікаў, батракоў, калі яны будуць падыходзіць па ўзросту і разумоваму стану.
1—3 Загадык Інстытута Глухапямых Севасьцянаў.

9 ліпеня г. г. роўна а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Гарсавету (Пляц Волі, 4, трэці паверх)
АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА
членаў бюро секцыі гарсавету, членаў бюро дэпутацкіх груп прадпрыемстваў гор. Менску, сумесна з па-заштатнымі інструктарамі, прымацаванымі для кіраваньня працай дэпутацкіх груп.
ПАРАДАК ДНЮ:
1. Даклад дэпутацкіх груп прадпрыемстваў г. Менску аб праробленай імі рабоце.
2. Аб справаздачнай кампаніі Гарсавету
ГАРСАВЕТ.

Нарсуд Сьмілавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 18-га сакавіка г. г. па арт. 196-213 КК абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку Заямянчанскай крамы Сьмілавіцкага спаж. т-ва Шыдлоўскаму Ўладзіміру Мікалаеву, за нядбайныя адносіны да загатовак лёнавалакна ў выніку чаго заданьне па ліку выканана толькі на 43 проц.

Нарсуд Смалявіцкага раёну, на падставе прысуду ад 27-га студзеня г. г. па арт. 196-і 1 ч. 213 КК, за нядбайныя адносіны да выкананьня службовых абавязкаў выразіўшыяся: 1) у недастаўцы яблык у раён, для адпраўкі ў рабочыя цэнтры і самаўласнае спажжэньня падводчыкаў прадуктамі з фонду рабочага спажжэньня, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. загадчыку Антопальскай крамы Смалявіцкага спаж. т-ва Козыру Міхасю Алексяваму.

Нарсуд Тураўскага раёну, на падставе прысуду ад 11-га сакавіка 1931 г. па арт. 213 КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў па загатоўцы колей для забою абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Флейтману Менделю Іцкаву служачаму загатаўлем ската Тураўскай спаж. кааператыву.

Нарсуд Дрысенскага раёну, на падставе прысуду ад 23-III г. г. па арт. 196-ІК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Круку Паўлу Ант. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Рэчыцкага раёну, на падставе прысуду ад 18 красавіка г. г. па арт. 196 з санк. 213 КК, за нядбайныя адносіны да хаваньня Леспрамгасаўскай маёмасьці абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне быўш. заг. Васілеўскага Вучлеспрамгасу Пікусу Трафіму М.

Нарсуд Лёзьнянскага раёну, на падставе прысуду ад 18 сакавіка г. г. па арт. 196—213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Міхайлаву Ц. Г.—служачаму Лёзьнянскай пошты за нядбайныя адносіны да абавязкаў у час дэжурства пры тэлефоне.

Вайсковы-служачы Мікалай Іванавіч Троцкі родам з гр-н Максоўскай вобласьці, Максацінскага раёну, з в. Малышава, які знаходзіцца на вайсковай службе ў гор. Магілеве зьмяняе сваё прозьвішча Троцкі на прозьвішча Летман.

Прозьба да асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, паведаміць аб гэтым Магілеўскі Гарадзкі ЗАГС, паказаўшы сваё прозьвішча, імя і імя па бацьку і месца жых.

Нарсуд Жлобінскага раёну, на падставе прысуду ад 27-4—31 г. па арт. 196—213 КК, працаўніку Жлобінскага Аддзяленьня сувязі Гарбунову А. П., за праўленую нядбайнасьць 12-XII—30 г. пры прыёме і выдачы пасылак у вагоне абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне.

Нарсуд Жлобінскага раёну, на падставе прысуду ад 4-5—31 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Фалейчыку Алесю А. за праўленую нядбайнасьць у бытнасьці старшынёю МК.

Нарсуд Круглянскага раёну, на падставе прысуду ад 9 красавіка г.г. па арт. 196—213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне сакратару Кручанскага сельсавету Старавойтаву Гаўрылу Яковаву, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

ЗГУБЛЕНЫ:

Членскі білет № 106364, выд. саюзам сельгаслесрабочых балот. інст. на імя Валахановіча М. А. Квіт. 384-п.

Пасьведчаньне аб скончэньні гідратэхнічных курсаў, выд. акркалгасаюзам паляводсаюзам на імя Валахановіча М. А. Квіт. 384-п.

Дакумант аб зьяцьці з вучоту, выд. МЦРК на імя Валахановіча М А. Квіт. 384-п.

Членскі білет выданы Аршанскім саюзам будаўнікоў за № 6-16986 на імя Сацюкова С. А. Квіт. 384-п.

Членскі білет, выд. Горацкім саюзам нарпіт на імя Сяргеева Н. А. Квіт. 384-п.

Чырвонаармейскі білет, выд. Аршанскім 192 палк. на імя Марсавар Р. М. Квіт. 384-п.

Пэнсіённая кніжка № 986, выданая Унецкай страхкасай Кузьмянкоу А. Ф. Квіт. 384-п.

Вайсковы білет, выд. Быхаўскай прызыўнай камс. у 1929 г. Алексенка З. Н. Квіт. 394-п.

Квіт. за № 166 на суму 10 руб., выд. Азарыцкай кааперэ. П'яўчыну Ф. Квіт. 395-п.

Кніжка на каня за № 1346, выд. Азарыцкім РВК Ягуру І. Н. Квіт. 396-п.

Кааперацыйная кніжка за № 54, выд. Ельскім спажыўтаварыствам у 1929 г. Скідану П. В. Квіт. 397-п:

Білет саюзу чыгуначнікаў № 82347 Іванкевіча І. Квіт. 398-п.

Білет саюзу сувязі г. Наварасійску на імя Сымончыка А. Квіт. 398-п.

Вайсковы білет, выд: г: Соч Сымончыку А. Квіт. 398-п.

Больнічны лісток ад 4-II, выд. у Тамбове Сымончыку А. Квіт. 398-п.

Пропуск на фабр. «Чырвоная Бярэзіна» ад 24-XI Янушкевічу Н. Квіт. 398-п.

Білет саюзу мэталістаў № 188410 на імя Казлова П. І. Квіт. 398-п.

Вайсковая кніжка, выд. Барысаўскім ваенк: Талкачу Н. Квіт. 398-п.

Білет ЛКСМ № 1011, выд. Растоўскім райк: Рыбкіну І: В: Квіт. 398-п.

Вайсковая кніжка, выд. Барысаўскім ваенк. на імя Рудзіна Б. Квіт. 398-п:

Талён выдзелкі працы на 40 руб. на імя Левіна Э. Квіт. 398-п.

Дублікат кніжкі № 25944 Барысаўскага спажыўтавар. на імя Нікуліча П. І. Квіт: 398-п:

Наборная кніжка, выд. Барысаўскім сталом пайшчыкаў Акулічу. Квіт. 398-п.

Часовае пасьведчаньне, выд. Барысаўскім ваенк. Селіцкаму П. І. Квіт. 398-п.

Лекавая кніжка і спраўка аб стажы Сакольскай: Квіт. 398-п.

Адрас рэдакцыі і выдав